Ніна Кісялёва



Мой лёс, мой боль, маё натхненне

Ніна Кісялёва

Мой лёс, мой боль, маё натхненне

Паэтычны зборнік

Мінск
«Народная кніга»
2009

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4 Беи)-5
К44

Кісялёва, Н.І

К44 Мой лёс, мой боль, маё натхненне : паэтычны зборнік. / Ніна Кісялёва. — Мінск: Народная кніга, 2009. — 152 с.

ISBN 978-985-6772-26-5.

У кнігу «Мой лёс, мой боль, маё натхненне» уключаны паэмы і вершы, у якіх праследжваецца лёс аўтаркі, яе хваляванні і радасці, трывога і надзеі.

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4 Беи)-5

Літаратурна-мастацкае выданне

КІСЯЛЁВА Ніна

Мой лёс, мой боль, маё натхненне

Паэтычны зборнік

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 06.07.2007. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Друк афсетны. Ум. др. арк. . Ул.-выд. Арк. . Наклад 300 экз. Заказ 467
УП «Выдавецтва "Народная кніга"». ЛВ № 02330/0133383 ад 13.07.2004.
Рэспубліка Беларусь. 220141, г. Мінск, вул. Ф. Скарыны, 51—29.
Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў тыпаграфіі
«Бізнесафсет». ЛП № 02330/0131682 ад 04.09.2006 г.
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 95/3.

ISBN 978-985-6772-26-5

© Кісялёва Н.І., 2009
© Афармленне. Выдавецтва «Народная кніга», 2009

Пуцявіны лёсу

Лагойшчына — цудоўны, непаўторны куток Беларусі. Яна чаруе і вабіць не толькі сваімі краявідамі, але спрыяе творчаму натхненню. Менавіта на лагойскай зямлі напісаў лепшыя творы Я. Купала. Тут карані З. Бядулі, Н. Гілевіча, М. Гіля, П. Сабіны, І. Пташнікава і іншых вядомых пісьменнікаў і дзеячаў культуры. Гэта родны, любы кут і Ніны Іванаўны Кісялёвай.

На пачатку 2008 г. выйшаў з друку яе першы паэтычны зборнік «А я надзеі не губляю». У час яго прэзентацыі Ніна Іванаўна паабяцала не спыняцца на дасягнутым. І слова сваё стрымала. Плённа і творча працавала ўвесь год і напісала новую кніжку «Мой лёс, мой боль, маё натхненне».

Вершы, паэмы, якія ўвайшлі ў дадзены зборнік, адкрываюць новую грань таленту Ніны Іванаўны, выдатнай настаўніцы, чалавека адкрытай, шчырай душы. Яна глыбока ведае свае карані, ганарыцца продкамі, услаўляе іх талент, прыгажосць і працавітасць, з радасцю і болем наведвае свае родныя мясціны, якія на ўсё жыццё прапісаны ў сэрцы. Сюды вяртаюцца яе ўспаміны, яе дачэрні позірк. Прыкладам таму служаць паэмы «Радаслоўная», «Гэта вашых продкаў лёс», вершы «Слядочкі», «Як мне цябе не хапае!..», «І мроіцца зноў успаміны...» і інш.

А з якім хваляваннем, шчырай захопленасцю, замілаванасцю перадае аўтарка назіранні за жыццём святых птахаў — буслоў! І прыходзіць да высновы: усё, бадай, як у людзей. Так і называе адну з цікавых паэм.

Сапраўдным шчасцем, гонарам Ніны Іванаўны з'яўляюцца яе сыны. З пяшчотай і шчырай мацярынскай любоўю, клопатам і трывогай за іх лёс піша яна паэмы «Парою толькі б і глядзела...» і «Васільком дык Васільком».

Ніну Іванаўну глыбока кранаюць і праблемы сучаснасці. Яна не мірыцца з п'янствам і дрэннымі звычкамі чалавецтва,

засцерагае ад іх нашчадкаў. Гэта ярка гучыць у вершах «Святы абавязак», «Дзелавая», «Брыдкая спакуса», «Гадавала матуля сыночка» і інш.

У вершы «Неслі святую Перамогу», паэме «Схіліце галаву над імі!» аўтарка ўслаўляе подзвігі абаронцаў Радзімы і аддае дань павагі загінуўшым у час Вялікай Айчыннай вайны.

Шмат твораў прысвечана пачатку высокай духоўнасці чалавека — каханню: «Пакінула мажор для новай песні», «Прыпомню той шчаслівы час», «Будзем жывы — сустрэнемся зноў», «Я толькі Вас бы пакахаў», «Прыйшоў наш час...».


Паэтка з годнасцю нясе крыж удавы і застаецца вернай таму, з кім «пражыла больш за трыццаць», шукае у знаёмых «хоць кропельку, рыску таго», заяўляе «ён адзін у душы і жыцці» і дорыць сябе толькі паэзіі, выяўляе трываласць і сілу характару, застаецца вернай ідэалу свайго юнацтва ў каханні і сяброўстве.

Пра што б ні пісала Ніна Іванаўна — пра боль ці радасць, — усюды адчуваецца ў яе творчасці вера і надзея: «... дасць здароўе Бог, жыццё расквеціцца вясёлкай», «жыццё прадаўжаць тут патрэбна». У звоне падаючай лістоты яна чуе гукі гітарнай струны, у голасе івалгі — ігру дзядулі на флейце.

— Лёгка ці цяжка пісалася гэта кніжка? — запытала я ў Ніны Кісялёвай. І яна адказала: «Лёгка і цяжка. Лёгка, бо само жыццё, сваё ці чужое, клалася на аркуш паперы. Цяжка, бо глыбока кранала сэрца ўсё перажытае, пачутае, а хацелася данесці да чытачоў тое, што дорага, люба, міла».

Дай жа, Божа, Ніне Іванаўне здароўя, сілы, надзеі і творчага, лёгкага палёту ў краіну Паэзія!

Марыя Сушко



Паэмы



Радаслоўная

Светлай памяці родных,
блізкіх, дарагіх

Ля балота, у нізіне,
Ёсць цікавая мясціна,
Тут нехта вёску заснаваў,
Чамусьці Чэрневам назваў.

Пасяленне не багата,
Няма золата і вапны,
Сівы пясок ды камяніца —
Вось чым славіцца зямліца.

Затое люд тут працавіты,
Таму куточак не забыты.
З ранку да вечара шчыруюць
І аддухі век не чуюць.

Люблю я гэты кут і люд,
Бо род бярэ пачатак тут,
Аб гэтым сведчыць не адзін век,
Праклаў прапрадзед першы след.

Была сяліба тут Жукоўскіх,
Людзей паважных і выносных,
Мелі не шмат яны зямлі,
Багаты дочкамі былі.

Чатыры зграбныя дачушкі,
Паслухмяны божы служкі.
Бацькам ва ўсім дапамагалі,
Летам — у полі, зімой пралі.

Жыць вучыла іх матуля,
Слаўная прапрабабуля,
З часам дочкі будуць маці,
На іх клопат ляжа ў хаце.

Старэйшую, бы кветку ружу,
Кахалі ў вёсцы хлопцы дужа,
Яна знарок не заўважала,
Язэпа з Лішчыц спадабала.

Парабкаваў ён у суседа,
Не раз з дзяўчынай вёў бяседу,
Рахманы, сціплы, чарнавокі,
Запаў у сэрца ёй глыбока.

Пагадзіўся і прапрадзед:
— Не будзе хлопец дармаед,
Малі, дачушка, пана Бога ,
Даўно мне трэба дапамога.

Дам надзел зямлі ўрадлівай,
Каб зажылі дзеці шчасліва.
Мы з маці вас благаслаўляем,
Доўгіх год жыцця жадаем.

Так з'явіўся тут прымака
Без вяселля і без свата,
Балцэвіч — прозвішча Язэпа.
Вось што вядома пра прадзеда.

Чым жылі продкі — не знаю,
Пэўна, тым, што і ўсе ў краі,
На свет пусцілі Янку, Антося,
Каб прозвішча іх не звялося.

Была ў іх яшчэ й дачка,
Дзяўчыну звалі Вандзечка,
Яна няшчасну долю мела,
Пад печкай у вайну згарэла.

Два браты — Антось і Янка —
Мелі зямлі сваёй дзялянку,
Дзе засявалі хлеб, гарох
І працавалі аж за трох.

Характар быў у братоў розны,
Янка — флегматык невыносны,
Без подбегу і памаленьку
Капаўся штось ля варывенькі.

І ў час касьбы ён не спяшаўся,
Марудна ў поле сабіраўся.
Заўчасна жонку пахаваў,
Адзін сыночка гадаваў.

А зусім іншым быў Антось.
Казалі, дзед мой, бы Савось,
Рухавы, спрытны і бадзёры,
Іграў на флейце адмыслова.

Карцёжнік яры, завадатар,
Касец умелы і араты,
Нікому ў танцах не ўступаў,
Як салавей, спяваў, свістаў.



Балцэвіч Антон Іосіфавіч, дзядуля (у цэнтры),
1915 г.

Я нават здымак дзеда маю,
З дзяцінства берагу, хаваю,
Тут ён з музыкамі-сябрамі
Яшчэ за царскімі часамі.

Першай жонкай у Антоські
Была Альжбета з іхняй вёскі.
Хлапца ў муках нарадзіла
І маладзенькаю спачыла.

Назвалі хлопчыка Антосем.
Нялёгка дзеду з ім жылося,
Таму да Ліса з Церахоў
Дзядуля выправіў сватоў.

У Ліса слаўныя дзяўчаты.
Насілі косы аж па пяты,
Марыля, Анця, Магдалена
І Анэля — цуда-дзевы.

Дзед Марылечку засватаў,
Прывёз яе ў сваю хату.
Добрай, шчырай і спакойнай
Бабку помню я пакойну.

Жылося ёй з Антосем цяжка,
Былі дзеці вельмі часты,
Першым з'явіўся мой татуля,
Не дай Бог такіх крыкуляў.

Крычаў днямі і начамі,
Даўся ў знакі сваёй маме,
А што трывожыла хлапчыну,
Не знаю я тую прычыну.

За семнаццаць год з Антосем
Бабулі дзесяць раз прыйшлося
Насіць пад сэрцайкам камочкі,
Дарыць жыццё сынам і дочкам.

Вельмі слабыя немаўляткі
Гасцямі былі ў мамкі, таткі,
Здаралася нават такое:
Хавалі разам аж па двое.

Шэсць маленькіх галубочкаў
Бог забраў з родных куточкаў,
Анёлы трэба былі Богу,
Таму ў рай дзецям дарога...

Занямог Антось зусім,
Прыйшлося развітацца з ім,
Сорак дзевяць год пражыў,
Схварэў, аслаб, рукі злажыў.

Як толькі перанесла бабка!..
Мне і цяпер уявіць цяжка:
Сорак два гады ўдавіцы,
Пяцёра дзетак ля спадніцы.

Ясю стукнула шаснаццаць,
Юльяну толькі чатырнаццаць,
Тры гады было Марусьцы
І паўгода меншай Лёньцы.

Антося — пасынка Марылі—
У Чырвоны Бор пераманілі:
Сама прыйшла ў сваты Гілена,
Высока, стройна, смела дзева.

Хлапец і мачыху зваў мамкай.
Яна была гэтага варта,
Шкадавала, нібы сына,
Хоць складаны быў дзяціна.

У шчэпку высахла Марыля.
Жыць не хацела, усё не міла,
Як жа справіцца з бядой
І падняць дзяцей адной?

Магла б прыняць яшчэ прымаку,
Казалі, бабку Франак сватаў,
Але ў самога шэсць унукаў,
Круглых сірот на адны рукі.

Ды праявіў сябе тут Яська,
Бачыў, што матулі цяжка,
За працу сам браўся хлапеча,
Рабіў, як бацька, усё дарэчы.

Вельмі рана прачынаўся,
Касу ў рукі — і падаўся
На балота, за Засценак,
Здабываць кароўцы сена.

Жылі ў страшнай беднаце,
Хацелі зарабіць каб дзе,
Яська араў, баранаваў,
За гарнец жыта адрабляў.

Юльян чужых пасвіў свіней,
Кароў, авечак і гусей,
Часцей таўкліся дзеці ў Ліса,
Заможны быў і жыў паблізу.

Ліс з дзядзькам Янкам сябраваў,
Таму ў двор дзяцей пускаў
Не толькі выканаць работу,
Але й пад'есці ў ахвоту.

Наталіць душу аладкамі,
Пагуляць з яго дзяўчаткамі.
Яніну, Ядзю і Марылю
Гушкалі хлопцы на арэлях.

Дзядзьку Ліса арыштавалі,
З роднага сяла саслалі,
Пагналі ўсю сям'ю ў Котлас.
Страшны лёс спаткаў заможных.

Гаварыў не раз мой тата:
— Людзей знішчылі багата,
Галаву не адзін склаў,
А за што? І сам не знаў.

Загрукацела і вайна,
Тады хапіла ўсім спаўна.
Як толькі вытрываў наш брат?
Не перанесці гора, страт...

Яську прызвалі ў ваенкамат,
Аднак адправілі назад,
Бо фашыстаў ужо войска
Было ля самага Лагойска.

Ляцелі немцы на ўсход,
Палілі, нішчылі народ,
У попел, дым ператваралі
Сотні Хатыняў, сотні Дальваў.

Наша вёска ля балота,
І лясоў не надта многа,
Таму фашысты абміналі,
Людзям не часта дакучалі.

У сорак другім аслаб Юльян,
Ногі цягнуў нібыта п'ян,
Пакінуў хлопец белы свет
У самы росквіт, самы цвет.

Ясю было дзевятнаццаць,
Да дзяўчат стаў прыглядацца,
Хадзіў да Гэлькі, заляцаўся,
А сватаць Ядзю сабіраўся.

Не проста так рашыўся Ясь
Сватоў да Ядзі пасылаць,
Ядзя — дзеўка з усіх дзевак,
Ёй не было роўных паненак.

Высока, стройна, бы рабінка,
У валасах прыгожа шпілька,
Курносы носік, твар прывабны,
Адным словам, пекна, зграбна.

Спявала Ядзя, бы салоўка,
Прыгожа танчыла з сяброўкай,
Падобна вельмі на артыстку,
А была тэлефаністкай.

Віхрам бегла на балота
Стагі складаць і насіць копы,
Дзеўка гарачая да працы.
Як жа з ёй не парукацца?



Балцэвіч Ядвіга Антонаўна, маці, 1940 г.

Ясь з яе дзядзькам сябраваў,
Намер яму свой расказаў,
Папрасіў схадзіць ён дзядзьку
Пляменніцу засватаць, Ядзьку.

Пад вечар неяк, у нядзелю,
Дзядзька Пётра быў пры дзеле,
Падаўся да сястры Анэты
Для вельмі важнае патрэбы.

За ім і Ясь не адставаў,
Сваю задуму спараджаў,
Хоць бы згадзілася дзяўчына
І не адмовіла хлапчыне.

Лістапад быў, холад, золка.
Дзеці на печы, на пяколку
Разлегліся пасля палудня,
Заціхла ў хаце ўсё, бязлюдна.

Цішыню гэту якраз
І парушыў дзядзька-сват:
— Добры дзень, мая сястрыца,
Як бы нам тут паджаніцца?

— Да каторай жа дзяўчыны
Сватаць хочаш ты хлапчыну? —
Анэта хуценька спытала
І на лаву паказала.

— Да старэйшай жа, вядома.
Злазь, Ядзюня, з печы долу,
Уваж хлопца, ён кахае,
Яму трэба вось такая.

Дзеці сталі Ядзю пхнуць,
Услых крычаць: «Цябе завуць!
Злазь хутчэй, бо дзядзька Пеця
Зараз сцягне цябе з печы».

Зачырванелася дзяўчына,
Злезла з печы ледзьве жыва,
Сват хваліў хлапца Ясюню,
А сэрца Ядзі млела з суму.

Яна з дзяцінства Яся знала,
Не раз у пікара гуляла,
Ён быў на два гады малодшы,
Хоць невялічкі, ды прыгожы.

Чарнабровы, чарнавокі,
І ў сям'і не лежабока,
Але ж у Ядзі быў другі,
Любы сэрцу й дарагі.

Хлопец з хутара, Ігнасеў,
Яго таксама звалі Ясем,
З ім Ядзюня сябравала,
Не раз ля плоту прастаяла.

А тут, на табе, сваты...
— Што зрабіў, дзядзечка, ты? —
Пэўна, думала дзяўчына,
Не магла сказаць прычыну.

А хто б яе пачуў, паслухаў?
Айчым дабро даў і патупаў
За барматухай у камору,
Каб замачыць тую дамову.

Пярэчыць Ядзя не змагла,
Бо ў хаце лішняя была.
Сям'я ў мацеры другая.
Хто яе тут падтрымае?

Назаўтра ў дзядзькі ў бакоўцы
Яна сустрэла свайго хлопца.
— Бывай, — сказала, — назаўсёды,
Хоць і цяпер ты даспадобы.

Хлопец адпомсціў жаніху,
Пусціў пеўня пад страху,
Згарэла ўсё ў пуні Яся,
Толькі хата засталася.

Праз тыдні два гуло вяселле,
Вэлюм і белае адзенне
Да твару Ядзі пасавалі
І яшчэ болей аздаблялі.

Яська ў пазычаным жаніўся,
Дзякуй суседу, падзяліўся,
Кашуля белая, штаны
Яму цудоўна падышлі.

Прывёў ён жонку ў хаціну,
А там сястрыцы дзве — дзяўчыны.
Таму з першага дзянёчка
Ядзі хацелася ў прочкі.

Але маці кажа Ядзі:
— Шмат і так дзяўчат у хаце,
Прывыкнеш, свякроў не благая,
І Яська-зяць цябе кахае.

Працавалі з Ясем шчыра,
Стаў пакрыху жаніх мілы,
Нарадзілася й дачушка,
Звалі Анечкай пястушку.

У год вызвалення Беларусі
На фронт пайсці і Яська мусіў.
Прывыкла Ядзя, шкадавала,
З дачкой па мужу сумавала.

Захварэла потым Аня,
У шэсць месяцаў не стала,
Слаўная была дачушка,
Забраў Божа сабе служку.

Цяпер усё Ядзі не міла.
Штодзень хадзіла на магілу,
Бо перанесці было цяжка
Такую страту і без Яські.

А ён прайшоў да Кёнігсберга,
Гнаў фашыстаў, нібы звера,
Меў тры лёгкія раненні,
На штыку нёс вызваленне.

Прычакала Ядзя мужа,
Вернай жонкай была дужа,
Нікога к сэрцу не пусціла
Гэта цудоўная жанчына.

Ядзі хацелася мець хатку,
Хоць без акенцаў для пачатку.
— Не спяшайся, будзе і хатка, —
Паабяцаў ёй неяк Яська.

Дзяўчаткі ў маці падрастаюць,
Ёй ва ўсім дапамагаюць,
Хутка можна аддзяліцца,
Пра свой кут паклапаціцца.

Сямейка ў Яся прыбывала,
Ядзя зноў дзіця чакала.
Нарадзілася дзяўчынка,
І назвалі мяне Нінка.


Збудавалі сваю хатку,
Аддзяліліся ад бабкі,
Яшчэ сына нарадзілі,
Жылі добра, не тужылі.

Кожны дзень у іх быў клопат,
Праглі, смяглі над работай,
Рупнымі гаспадарамі
Іх у вёсцы называлі.

З дзяцінства дзетак прывучалі,
Каб самі на хлеб зараблялі.
Я і Лёнік, як мурашкі,
Працавалі ў гумне бацькі.

Абралі тату брыгадзірам,
Скажу адкрыта — і не дзіва,
Быў адказны, працавіты,
Хоць на рост і незавідны.

У двары жыла і бабка,
Памагаў ёй сынок Яська
Араць зямлю, касіць адонкі,
Не было б толькі гамонкі.



Ніна Кісялёва з бацькамі, 1948 г.



Ніна Кісялёва з бацькамі, бабуляй Марыляй і братам Леанідам, 1951 г.

Маруся ў горад падалася,
Там на свой хлеб перавялася,
За ёй пайшла і Лёнька з хаты,
Узяўшы скарб свой небагаты.

Знайшліся дзеці ў дачушак.
Дзе ж падзець маленькіх птушак?
Бабка іх яшчэ глядзела,
Песні-калыханкі пела.

Потым вырашылі дзеці:
Хай бабуля ў горад едзе,
Зяць будуе новы дом,
Хопіць месца ўсім там.

Так стала бабка гарадскою,
Аж дваццаць год жыла з дачкою,
Вярнулася ўжо на радзіму,
Калі паклалі ў дамавіну.

На сялібе Ядзя з Ясем
Абжыліся ўжо тым часам,
Усяго было ў жыцці,
Але закон продкаў такі:

Раз прад Богам павянчаліся,
Цярпелі, век не разлучаліся.
Рэй сямейны вяла Ядзя,
Уступаў ва ўсім ёй Ася.

Іншы раз, праўда, бывала,
Фантанам бацьку прарывала,
Заціхала тады маці,
Каб пазбегнуць гвалту ў хаце.



Ядвіга Антонаўна і Іван Антонавіч, бацькі, 1957 г.

Мама — строгая не ў меру —
Як толькі што, каб вас халера,
Такога выдасць дыхту, жару,
Як быццам выскачыш з пажару.

Лёніка песціла, любіла,
У воку стрэмкай была Ніна,
Што не зраблю — усё няўгодна,
На бацьку я вельмі падобна.

Вось дзе хавалася прычына.
Так і не ведала дзяўчына.
Праз шмат гадоў мне стала ясна,
Калі ўжо матуля згасла.

У інстытут я паступіла,
Сцежку сама працерабіла,
Стрэла свайго каханага,
На ўсё жыццё абранага.

Аўдавела, праўда, рана,
Пакінуў мне Паўлуша рану
І два сыночкі ўдалыя,
Дзякуй Богу — не малыя.

Праз год забрала ў Мінск я тату
І прадала ў Слабадзе хату,
Што будавалі ўсёй сям'ёй,
Хацелі з Паўлам жыць у ёй.

Жыў побач Лёнік, у сталіцы,
Прапаршчыкам у Сцяпянцы
Адслужыў, пайшоў у адстаўку,
У татаву стаў ездзіць хатку.



Кісялёў Павел Міхайлавіч, муж, 1966 г.

Падняў сыночкаў-галубочкаў,
Але загінуў у адну ночку,
Хацела б знаць я дасканала,
Як смерць браточка даканала.

Падтрымлівалі толькі дзеці:
— Глядзі сябе і дзеда, маці,
Здароўя ты сама не маеш,
А дзядзьку ўжо не адкапаеш.

Шэсць год пражыў у мяне тата,
Мела клопату багата,
Здароўя ён зусім не меў,
Нудзіўся, сумаваў, не еў.

Вельмі зблажэў пасля таго,
Як пахаваў сына свайго,
На леках толькі і трымаўся,
Памяраць штодзень збіраўся.

Слаба бачыў і чуў дрэнна,
Лячыла тату, ды дарэмна,
Не вытрымала болю сэрца,
Прыйшла пара яму памерці.

На восемдзесят шостым годзе
Спачыў старэйшы ў нашым родзе,
Перажыў бацьку і маці,
Чаргу ўступіў нават дзіцяці.

У канцы жыцця ўспамінаў:
— Дарма да Ядзі свата слаў,
Загубіў такую кветку,
Кахаў, любіў сваю кабетку.

Адказаць, бач, не пасмела,
А чаго маўчала дзева?
Ні разу так і не сказала,
Можа, пасля і шкадавала.

Вось так мялеў наш род паціху,
Хапіла ўсім бяды і ліха,
Цёткі Вандзі даўно дзеці
Сатлелі ў сырой зямельцы.

Янкаў унук нават спачыў,
З сабою бацьку прыхапіў,
А быў бы добры ён хлапчына,
Каб заўчасна не загінуў.

У брата таты, дзядзькі Антося,
Толькі Лена засталася.
Як яна, бедная, утрывала —
Шэсць маладзейшых пахавала.

Яны даўно ўжо на радзіме,
Куды ні кінь — адны магілы.
У святы дзянёчак нас чакаюць,
Маўчаць зацята, не вітаюць.

Стаю прад імі і малюся,
Не дагадзіць усім баюся,
Прашу, каб доўга нас чакалі,
А самі ціха-ціха спалі.

Дай жа, Божа, нашым дзецям
Пажыць на гэтым белым свеце,
Да нас сцяжынкі пратаптаць,
Травіцу ў продкаў пазрываць.

Прадоўжыць род наш працавіты
І ведаць, хто ты і адкуль ты.
Таму паэму я стварыла,
Сакрэты роду ўсе раскрыла.

Хай прачытаюць дзеці, унукі,
Як пажывалі іхні продкі,
Дзе іх пачатак, карані
На святой нашай зямлі.

Гэта вашых продкаў лёс

Чуць толькі лета наступае,
Той дзень, як хваля, набягае,
І коціць з небывалай сілай
Юнацтва час, цікавы, мілы.

Я з галавой туды ныраю,
Усё да драбніц успамінаю,
Не супраць падзяліцца з вамі,
Чаго хацелася часамі.

— Хаценне ваша — смех дый годзе, —
Цяпер сказала б наша моладзь.
У той жа час — голад, нястача,
Прыпомніш зараз — душа плача.

Была дзяўчына я ўжо ладна,
Хлопцы кідалі позірк зманны,
Дарылі кветачкі — валошкі,
А ў мяне — босыя ножкі.

Праўда, на гэта не зважалі,
Бо так было і ў іхняй долі,
Запрашалі на вячоркі
Сум развеяць, думкі горкі.

Вячоркі ладзілі цікавы,
П'есы ставілі Купалы,
Варажылі на рамонках,
Спявалі хораша і звонка.

Удзень на працы рвалі жылы,
Бацькоў слухалі, служылі,
Падсаблялі ва ўсім,
Каб лягчэй жылося ім.

— Дзеці босы — вось бяда,
Прыдбаць хоць бы медзяка, —
Гаварыў тата, злаваўся,
А на начлег штодзень збіраўся.

Аднойчы, праўда, па вячэры
Сям'ёй параіліся шчыра,
Каб не параніла я ножкі,
Купіць рашылі басаножкі.

Сяброўкі іх яшчэ не мелі,
Мая душа чакала, млела.
Першай мама ўзяла слова,
Унесла слушну прапанову:

Трэба прадаць курку-чубатку,
Ніякага з яе прыбытку,
Не нясецца, штогод квохча,
А есці кожны дзень ахвоча.

Так настаў жаданы час,
Святы дзянёчак быў у нас,
Не помню — спала ці не спала,
Але ранюсенька ўстала.

Маці пякла ўжо бліны,
А пах у хаце быў які!
Бацька прынёс скрылёчак здору,
Запрасіў усіх да столу.

Я на хаду бліны хапала,
Пальцы, вусны паапякала,
Напілася сырадою
І закончыла з ядою.

Адзела хуценька шкарпэткі,
Дастала маміны балеткі,
Трохі былі велікаваты,
Але ў насы напхала ваты.

Тата прынёс чубатку зграбну,
Пасадзіў у сумку зрэбну,
З сяброўкай Зонькаю сышліся
І ў Плешчаніцы падаліся.

На выган выйшлі, а там валам
Людзі валілі да базара,
Неслі што-небудзь прадаваць,
Каб хоць капеечку прыдбаць.

Раптам Вінька даганяе,
Рагоча гучна і пытае:
— Што вы цягнеце, мурашкі?
Ці не сівухі там біклажкі?

Давайце сумку паднясу,
Не бойцеся, не адап'ю,
Штосьці задумалі купляць
І хочаце пагандляваць?

Ля Засценка матавоз,
Ідзіце, падвязе хоць вас,
А то прыстанеце ў дарозе,
Не на кані ж і не на возе.

Сэрца трывожна ўстрапянула,
Думка скроні казытнула:
— Што будзе, калі ўбачыць куру?
На смех падыме д'ябал здуру.

Сораму не абарэшся,
З чубаткаю дамоў папрэшся,
Тым больш, што хлопцы-церахоўцы
Чуць не побач, за ядлоўцам.

Я ў кулачок сябе згарнула,
Дзядзьку Віньку сказанула:
— Свая ноша нам не цяжка,
Каб былі тут і біклажкі.

Яшчэ хопіць часу ў нас,
Памалу данясём без вас,
Мы цягавіты, нам не нова,
Дзякуем за прапанову.

На матавоз дайшлі ўдала,
Прыселі нават там на лаву,
А людзей паўным-паўнютка,
Як сабак, налезла ў будку.

Нарэшце гарадскі пасёлак,
Шыбуюць людзі з усіх сёлаў,
Крычаць, гамоняць і жартуюць,
Тавар усякі прапануюць.

Мы з Зонькай пахадзілі крыху,
Набраліся смеласці, пыху,
Замок заела, разарвалі,
З сумкі чубатачку дасталі.

Вызвалілі куры ножкі,
Хай адпачне бядняга трошкі,
Распушылі чуб і хвост,
Каб толькі Бог купцоў прынёс.

Ды бачым: кура карчанее,
І згасае ўся надзея,
Толькі вырвалася з дзюбкі:
— Кур-кур, кур-кур,— маёй галубкі.

Чубатка выпрастала ножкі,
Галоўку адкінула на дошкі,
Грэбень павіс і змяніў колер,
Вось табе курына доля.

Як жа быць цяпер нам далей?
З Зонькай думалі, гадалі,
Слінай курачку паілі,
Але дарма, не ажывілі.

Што толькі я перажыла!..
Лепш бы босая была,
Чубатку кінула пад плот,
Пабегла з плачам да варот.

Нават забылася пра сумку
І два рублі ў ёй для ратунку,
Мне дала іх цётка Маша,
Што няньчыла яе я Сашу.

Зонька была крыху старэйшай,
Таму, вядома, разумнейшай,
Сумку ўзяла, мяне дагнала,
Шчыра, ветліва сказала:

—Не плач, Нінуля, не журыся,
Глыні вадзічкі і памыйся,
Я тваю бяду-нуду
Адным пальцам развяду.

Толькі нікому не кажы:
У мяне ёсць тры рублі,
З вясны я шчаўе прадавала,
Па капейцы наскладала.

Плюнь на курачку-чубатку,
Пераждагнайся для парадку,
Паціху пойдзем у раймаг,
Прагонім смутак там і страх.

Не стала я пазыку браць.
Чым буду потым аддаваць?
Хіба што тымі працаднямі,
Што буракі палола днямі.

Прыйшлі з сяброўкай у раймаг.
І пасвятлела мне ў вачах.
Шмат абутку на паліцах,
Толькі можна падзівіцца.

Але панеслі мяне ножкі
Туды, туды, дзе басаножкі,
Адны-другія пакруціла,
Мерыць усё-такі рашыла.

Раптам павекі задрыжалі,
Слёзы пырснулі ад жалю,
Бо на тыя басаножкі
Не хапала грошай трошкі.

Сяброўка-Зонька папрасіла:
— Вазьмі рублёўку, не плач, Ніна.
Збярэш шчаўе, прадасі,
Доўг паціху аддасі.

Так мы купілі басаножкі,
Выйшлі з падскокам на дарожку,
Што вытапталі праз балота
Да Саўрыцкага аж плота.

На базар забеглі хутка
Паглядзець, ці ляжыць курка,
Развітацца назаўсёды
З такой важнаю асобай.

Я схітрыць хацела дома,
Не гаварыць пакуль нічога,
Але матуля запытала:
— Ну, як чубатку прадавала?

Расказала пра ўсё мамцы,
Хоць трэслася, бы ў ліхаманцы,
Але яна не папракнула,
Толькі цяжка ўздыхнула.

І з парусінавай насоўкі
Дастала спрытна аж рублёўку.
— Басаножкі не з'ясі,
Аднак вазьмі і аднясі.

Я доктарцы кафтан пашыла
І на мыла зарабіла,
А раз так — пачысцім грубку,
Настоім попелу кадушку.

Толькі сэрцы нашых маці
Дзяцей так могуць падтрымаці,
Загаіць пякучы раны,
Суцешыць боль іх нечуваны.

Мы і цяпер з Зонькай сябруем,
Адна другой тэлефануем,
Падчас страчаемся ўлетку,
Яна ж была мая суседка.

У Плешчаніцах як бываем,
Курку-чубатку ўспамінаем,
Пра той час, пра басаножкі,
Пасмяемся з сябе трошкі.

Мінула больш паўсотні год,
Цяпер няма такіх турбот,
Але старасць не за горкай,
Уцячы б ад яе з Зонькай.

Спаліць, развеяць едкі дым,
Быць здаровым, маладым,
Парадавацца гэтым часам,
Зрэдку топнуць хоць абцасам.

На гэтым, мілыя, бывайце,
Нашу гісторыю чытайце,
Гэта вашых продкаў лёс,
Дай Бог, каб абышоў ён вас.

Усё, бадай, як у людзей

На дачы нашай, каля хаты,
Бетонны слуп стаяў зацята,
Суседцы ён мазоліў вока,
Хоць ад яе быў і далёка.

Але вазьму я лепш за гонар
Не абмяркоўваць яе нораў,
А да свайго вярнуся слупа
І любімага мне кута,

Дзе шмат было розных падзей,
Усё, бадай, як у людзей:
Узлёты, радасці, падзенні,
Незабыўныя здарэнні.

Толькі я на гэты раз
Пра птахаў павяду расказ,
Буслоў мілых, дарагіх,
Маю прывязанасць да іх.

Прынёс баронку Валер Маслаў,
Ён сусед вельмі запасны,
Але для нас не шкадаваў
І проста так падараваў.

Мелі мы такі рыштунак,
Толькі не вернеш падарунак,
А каб не крыўдзіць нам суседзяў,
Далі заданне сваім дзецям.

На наш слуп, высокі, гонкі,
Хлапчукі ўзнялі баронку,
Зверху накідалі галін,
Сухой травіцы з-пад малін.

Паўдня былі дзеці ў рабоце,
Не па загаду, па ахвоце,
Вельмі хацелася ўсім нам,
Каб спадабалася буслам.

На жаль, буслы не прыляталі,
Як бы, разумныя, усё знялі:
Быў гаспадар смяртэльна хворы,
Навісла над сядзібай гора.

Слупу знайшлі мы прымяненне:
На ім зрабілі зазямленне,
Каб на сябе браў перуны,
Абараняў нас ад бяды.

Аблюбавалі яго й птушкі,
Гнёзды рабілі шчабятушкі,
Выводзілі сваё патомства,
Спявалі з узыходу сонца.

Так прайшло ў нас тое лета,
Дзякуй пярнатым і за гэта,
Мы спеў іх слухалі ўранку,
І як бы заціхала ранка.

У жніўні птушкі адляцелі,
Сядзіба наша сірацела,
Было нудна і журботна,
Згасала лета, сыра, мокра.

Прыйшла пара нам у дарогу
З любімай нашае бярлогі,
Ураджай сабралі ўдачны,
Што рабіць цяпер на дачы?

Зіма была цяжкай, тужлівай,
Не стала мамы, памёр мілы,
У самой трымцела сэрца,
Ды дзякуй Богу — перанесла.

Каб прагнаць бяду-нуду,
Званіла часта ў Слабаду,
Там было маё збавенне,
Вясну чакала з нецярпеннем.

І вось аднойчы звоніць Тома:
— Ёсць гаспадар ужо ля дома!
Прыязджай яго вітаць,
Пакуль адзін яшчэ, відаць.

Выбірае, пэўна, месца,
Каб спадабалася нявесце,
А сам стройны і цыбаты,
Як арол, на каньку хаты!

Хоць у самоце і журбе,
Але я зноў у Слабадзе,
Гляджу на бусліка, малюся,
Каб сёлета тут жыць застаўся.

Толькі і на гэты раз
Не пасяліўся ён у нас,
Не мог глядзець на мае слёзы,
Што сыпаліся, нібы росы.

Клекатаў і шчоўкаў звонка,
Прывабіў пекную сяброўку,
Разам выбралі мясціну
На ліпе, ля Думанскай Зіны.

Дбайна ладзілі гняздзечка,
Паклалі свежыя яечкі,
Але, на шчасце ці на гора,
Наляцела раптам бура.

Віхры круцілі, звярэў вецер,
Пакрышыў на ліпе вецце,
Скінуў буслікаў гняздзечка,
Пабіў наседжаны яечкі.

Праўда, буслы не далі маху,
Ці ад болю, ці ад страху
Прыбіліся да нас, на слуп,
Абжыліся хутка тут.

Будавалі зноў гняздо,
Мацнейшае, чым перш было.
Дружна, гучна клекаталі,
Часта дзюбамі трашчалі.

Не забывалася бяда,
Яны ўдваіх, а я адна,
Думкі хмарамі плылі,
Ды разганялі іх буслы.

Цешылася я з сяброў,
І заціхаў паціху боль,
Дзяліла з імі сум, маркоту,
Днямі займалася работай.

Часта ездзіла да таты,
Быў яшчэ ён зухаваты,
Але прыбраць, абмыць ляцела,
А ў Слабаду ізноў карцела.

Як там птушыначкі мае?
Пэўна, сумуюць без мяне.
Хто прывітае іх уранку,
Каму загояць яны ранку?

Сяброўкі мяне страчалі,
Як дзеці, радасна пішчалі,
Нібы расказвалі навіны
Сваёй любімай гаспадыні.

Канчаўся жнівень, не адляталі,
Са мною шчыра гаравалі,
Я парабіла ўсё на дачы,
Чакала ў школе мяне праца.

Хоць і ў сталіцу падалася,
Душа ў Слабодцы засталася.
Толькі праз дзень сказаў сусед:
— Буслы зляцелі прама ўслед.

Нарэшце, мілыя, зляцелі,
А мне пакінулі надзею:
Прылятуць ізноў на слуп,
Вернуцца ў свой родны кут.

Забрала ў лютым бацьку з вёскі,
Было ўжо ездзіць невыносна.
Цяжка насіць ваду і дровы,
Бо сам быў тата нездаровы.

Дні большалі, святлей, відней,
І на двары значна цяплей,
Млела, плакала зіма,
Памалу тупала вясна.

У красавіку — зноў Слабада,
Аж бачу: буслоў чарада,
Лунаюць птушкі ў паднябессі,
Гатовы і мяне панесці.

Раптам двое адлучыліся,
На вільчык хлева прызямліліся,
Чакалі нашае сустрэчы
Мае мілыя малечы.

Пільна агледзелі гняздо,
Ці не змянілася яно.
Галля сабралі і саломы,
Цягнулі ў дзюбах усё дадому.

Назіраць было цікава,
Як на гняздзе стаяла пара,
Бусел крылы распускаў,
Сяброўку лашчыў, абдымаў.

Казытаў пышну бародку,
Цалаваў вельмі салодка,
Потым галоўкі закідалі,
Здаецца, ва ўнісон спявалі.

Самка выконвала работу:
Несла яечкі — працяг роду,
Села рупліва награваць,
А бусел прадаўжаў лятаць.

Лятаў да рэчкі, на балота,
Штось шукаў часам ля плота,
Бацька будучых дзяцей
Быў працавіты дабрадзей.

Як прылятаў, самка страчала,
Нават з яечак уставала,
Відаць, кахала свайго мужа
І чакала яго дужа.

Запішчалі хутка й дзеці,
Патрабавалі піць і есці,
Буслік з сілы выбіваўся,
Цэлы дзень для іх стараўся.

Я на другі лезла паверх,
Каб убачыць, колькі іх,
Не дасягнула, праўда, вока,
Гняздо буслоў было высока.

Час ішоў, раслі і дзеткі,
Адзін дык быў даволі крэпкі,
Падскокваў, крыльцамі махаў,
Нібы чачотку адбіваў.

Пазней яшчэ ўзнялося трое,
А ўсіх было чацвёра,
Прыгожых, стройных святых птушак,
Пацешных, мілых маіх дружак.

За гэты час буслік схуднеў,
Дзяцей карміў, а сам ці еў,
Каб пазбегнуць страт і ліха,
Корм здабывала ўжо й бусліха.

Накарміць столькіх не жарты,
І да чаго ты будзеш варты,
Калі сканаюць твае дзеці,
Горшай бяды не будзе ў свеце.

Па чарзе бацькі ляталі,
Дзяцей адных не пакідалі,
А яны былі пражоры,
Крычалі, нібы на пажары.

Дзяўблі тату, скублі маці,
Ад крыку не ўседзець у хаце,
Хапалі прама з дзюб бацькоў
Гадзюк, і жаб, і чарвякоў.

У спёку ліпеньскімі днямі
Буслы дзетак прыкрывалі,
Насілі з сажалкі ваду,
Каб лягчэй знеслі спекату.

На буслянцы стала цесна,
Прыляціць бацька — няма месца
Паставіць дзе цыбаты ногі,
Хвілінку адпачыць з дарогі.

Таму часта на каньку
Страчаў вячэрнюю зару,
Маці ж ад дзяцей нікуды,
Хоць і клікаў яе любы.

Ды аднойчы мне здалося:
Штосьці ў буслікаў страслося,
Пішчаць, дзяўбуць дзеці матулю,
І не відаць нідзе татулі.

У роспачы маці-бусліха,
Што за праява, што за ліха
Навісла над яе сям'ёй,
Як хмара чорная зімой?

Патрабуюць дзеткі жаб,
Згадзіўся б зараз і слімак,
Толькі як яго даставіць,
На каго малых аставіць?

Як пазней стала вядома,
Не цягне бусліка дадому,
Знайшоў сяброўку маладую,
Высока кружыць над ракою.

Цешыцца цяпер з другой,
На буслянку — ні нагой,
Забыўся пра дзяцей і маці,
Пакінуў бедных гараваці.

Маці ж баіцца за дзяцей,
Побач сусед-ліхадзей.
Буслы не любяць, калі ў іх
Адно балота на дваіх.

І ўсё-такі яна ў палёце,
Глытае жабак на балоце,
Лятае так дзянёк-другі,
Дзеці ў гняздзе зусім адны.

Прылятаў сусед, кружыў,
Як бы буслянят лічыў,
Аднойчы падсцярог адных
І задзёўб зразу траіх.

Толькі меншанькі застаўся,
На дно гнязда, відаць, схаваўся,
Не міла беднаму буслянка,
І на балоце яшчэ мамка.

Я зусім выйшла са строю,
Была ўзрушана бядою,
Шкадавала малых дзетак,
Жменю прыняла таблетак.

Уголас плакала, крычала,
Здаецца, бусла разарвала б,
Нарабіў мне столькі болю,
Што не забыць яго ніколі...

Уяўляла прылёт маці
І карціну, што ўбачыць...
Аж гляджу — яна ўжо тут,
Разглядае родны кут.

Зразумець ніяк не можа,
Што тут здарылася, Божа ...
Так стаяла да цямна,
Быццам не ў сабе была.

Я разам з сонейкам устала,
На буслянку паглядала.
І раптам закружыў мой бусел.
Ці не вярнуцца бацька мусіў?

Спрытна спусціўся на гняздо,
Цяпер раскошна там было,
Бусліха быццам бы застыла,
Яго прылёт не ацаніла.

Адчула сэрцам я спаўна,
Што цяпер думала яна...
Але прымусіла жыццё,
І даравала буслу ўсё.

Як на дражджах, расло дзіцятка,
Цешыліся бацька, матка,
Бралі з сабою на балота,
Разам тупалі ля плота.

У жніўні закружылі трое
Над сядзібаю маёю,
Я з іх не зводзіла вачэй,
І на душы стала лягчэй.

У заключэнне я адзначу:
Прадала сяброўцы дачу,
Хай жывуць шчасліва людзі,
І мой кут ім любы будзе!

Мне яна ўжо не па сіле.
Мо прабачыць Павел мілы?
Парушыла яго наказ,
Не вытрымала гэты раз.

Праўда, кожную вясну
Магнітам цягне ў Слабаду
Убачыць Віктара, Тамару,
Валеру, Саліка, Святлану.

Цікаўлюся, ці жывуць птахі
На буслянцы каля хаты?
Уяўляю іх гняздзечка,
А там — жыццё, а там — яечкі.

Мае птахі, сябры мілы,
Хай дае вам Божа сілы!
Прылятайце на наш слуп,
Вас чакае родны кут.



Ніна Кісялёва (у цэнтры) з бацькам, сватам, нявесткай і ўнучкай ля сядзібы ў Слабадзе, 2002 г.

Парою толькі б і глядзела ...

Была на курсе я ўжо пятым,
Як пажаніліся мы з Пашам,
Хутка прамчаў апошні год,
Вось і дыплом, я — педагог.

Муж працаваў у авіяцыі,
А я ў вёсцы, на выкацыях,
Дапамагала бацьку, маці
Кароўцы сена рыхтаваці.

Рана з'явіліся грыбы:
Лісічкі і баравікі.
Пайсці ў лес мне не цярпелася,
Грыбоў смажаных хацелася.

Мама з усмешкай запытала:
— Штось грыбоў ты зажадала?
На гэта, можа, ёсць прычына?
Ты ж замужняя жанчына...

Што сказаць мне было маці?
Чакала я ўжо дзіцяці,
На днях да ўрача хадзіла,
Хоць бы ў тэрмін нарадзіла.

Напісала ў пісьме Пашу
Пра навіну важную нашу,
Не знаю, як рэагаваў,
Але ў адказе напісаў:

— Пазбягай цяжкае працы,
Беражы жыццё дзіцяці,
Памнажай, жоначка, сілы,
Нарадзі мне толькі сына.

У Салігорску быў мой Павел,
Таму ў бальніцу брат даставіў,
Чакаў пляменніка таксама
І з вечарынкі прыйшоў рана.

Вядома, каб не дактары,
Не разрадзілася б тады,
Была худзенькай і драбненькай,
Сілы не мела, як паненка.

І вось з'явіўся наш сынок,
Падаў ён гучна галасок,
Доктар паказвае хлапчыну,
А ў мяне слёзы ручаінай.

Ад радасці ліліся слёзы,
Хлопчык быў вельмі прыгожы:
Тоўсценькі, зграбненькі, вялікі,
Спаў і соп у абедзве дзіркі.

Назаўтра Павел прыляцеў,
Сыночка ўбачыць захацеў.
Праз акно сына паказала.
— Увесь як ты, — мужу сказала.

Шчасцем поўніліся грудзі,
Віншавалі ўсе людзі.
Хлопчык асілкам выглядаў,
Больш чатырох кіло набраў.

Павел пусціўся па радні
Расказаць аб гэтым дні,
Даў тэлеграму цешчы, цесцю
І сваім бацькам, канечне.

Прыкаціла й баба Ядзя,
Віншавала Пашку-зяця
З папаўненнем дарагім,
Унукам першанькім сваім.

Потым нас забрала мама,
Глядзець Дзіму памагала,
Любіў унука і дзядуля,
Хоць хлопец быў, скажам, крактуля.

Ён не плакаў, а крактаў,
Уначы спаць нам не даваў,
Круціўся штось у сваім ложку,
Нібы яго кусалі блошкі.

Любілі Дзіму і ў Лагойску,
Унучак быў там частым госцем,
Сабраў кропелькі татулі,
Быў любы дзеду і бабулі.

Трэба было абжывацца,
Таму выйшла я на працу,
У пяць месяцаў Дзімулю
Пакінула на бабулю.

На працу ездзіла аж з вёскі,
Цяжкавата, але зносна,
Урокаў мовы было мала,
Усе за два дні выдавала.

У «Цепласеткі» пайшоў Павел,
Кватэру там нам абяцалі,
Чакаць доўга не прыйшлося,
Праз дзесяць месяцаў збылося.

Пераехалі ў Чыжоўку
І забралі ў горад Дзімку,
Ён быў спакойны і нясмелы,
Баяўся ўсякае хімеры.

Адбітак вёскі зрабіў справу
На хлопца нашага па праву,
Узяліся мы за выхаванне
І пашыраць яго пазнанні.

Бралі з сабой на адпачынак,
Каб свет пабачыў наш хлапчына,
Прымаў навуку ён бясспрэчна,
Рос добрым, шчырым, чалавечным.

Васю чакаў, быў вельмі рад,
Ганарыўся: «Вось мой брат!»
Гуляў з малым Васільком,
Паіў яго малачком.

Гаварыць, хадзіць вучыў,
Добрай нянькай Васю быў,
Той таксама любіў Дзіму,
Вытвараў з ім розны дзівы.

Цешыліся мы з дзяцей
І ўскладалі шмат надзей,
Прывучалі іх да працы,
Нідзе, ніколі не губляцца.

Добра скончыў Дзіма школку,
Веды меў не ў адну столку,
Ды першы год не паступіў,
Бо з Піфагорам не дружыў.

Бацька сказаў: «Не гаруй, брат!
Галоўнае — ваенкамат...
Хоць бы на год цябе забыў,
У Карабах не падхапіў».

Як жадалі, так збылося,
Праз год паступіць удалося,
Стаў студэнтам інстытута,
Далася ў знакі там навука.

Але засеў Дзіма за кнігі,
Цяпер дзяўчаты ўсе да фігі...
Дарога веды патрабуе,
Калі не так, то не даруе.

І ўсё пайшло, нібы па масле,
Цікавасць да ДАІ не згасла,
Заўважылі гэта і людзі:
Спецыялістам добрым будзе.

Праца нялёгкая, вядома,
Бывае рэдка калі дома,
Патрабавальны сынок, строгі
Да тых, хто бараздзіць дарогі.

Сустрэў каханне на Сямашка,
Іспыт трымала там Наташка,
Праворна дзеўка, малайчына,
Лейтэнанта падкупіла.



Сын Дзмітрый, унучка Насця і нявестка Наташа, 2007 г.

Ну, бясспрэчна, прыгажосцю.
І стаў Дзіма частым госцем,
Так лёс яны свой павязалі,
Упэўнена, не прагадалі.

Дай, Божа, ім здароўя, згоды,
Толькі прыемныя турботы,
Радасці, шчасця і дастатку,
У хаце поўнага парадку.

Расце ў пасадзе мой сынок,
У сваёй справе ён хадок,
Знешне падобен на Паўлушу,
Гляджу на сына — бачу мужа.

Парою толькі б і глядзела
Я на сынка свайго без меры,
А яму няма ўсё часу
Напомніць мацеры пра Пашу.

Дзіма ўмее ўсё рабіць:
Касіць, араць, пячы, варыць,
Перадаліся гены бацькі,
Пахвалы сыночак варты.

Прыгожы, падпалкоўнік важны,
Найлепшы «ювелірны майстар»,
Так «адчаканіў» Насцю нашу,
Уклаў усе кропелькі Наташы.

Любоў сваю ёй даказаў,
У жывой дачушцы паказаў.
Удзячна Насця свайму татку,
Пяшчоту дорыць яму, ласку.

Сын пра маё здароўе дбае,
У санаторый адпраўляе,
Адпачывай, лячыся, маці,
Табе яшчэ трэба пажыці.

А я малю анёлаў, Бога,
Каб была роўная дарога,
Зорная месячная ночка
У майго старэйшага сыночка.

Ганаруся сваім Дзімам,
Хачу, каб меў ён яшчэ сына,
А той падобен быў на бацьку
І ўвекавечыў дзеда Пашку.

Васільком дык Васільком

Была нядзеля, дзень святочны,
Мы з мужам грэліся на сонцы,
Ля Курасоўшчыны, у садзе,
Імя прыдумвалі дзіцяці.

— Імён у слоўніку багата,—
Прамовіў нечакана тата.—
Дзевяць месяцаў к канцу,
Пара з'явіцца і хлапцу.

— Навошта слоўнік? Глянь у жыта,
Васількоў там шыта-крыта,
Давай сыночка назавём
Цудоўным імем — Васільком!

— Васільком дык Васільком,
Быў бы толькі жыў, здароў,—
Шапнуў на вуха мне Паўлуша,
Прытуліў да сябе дужа.

Назаўтра хлопчык Васілёк
Сціпла даў маці намёк:
— Хачу на белы свет з'явіцца,
Пара, матуля, у бальніцу!..

— Згодна, мой сыночак мілы,
Заводзь, бацечка, машыну,
Трэба хуценька збірацца,
Сыночак хоча нараджацца.

Нараджаўся ў цяжкіх муках
Васілёчак наш, пакутнік.
Дзякуй Богу, усё знёс,
Асілак быў хлопчык у нас.

Важыў ён чатыры трыста,
Характар праяўляў з дзяцінства,
Старчаком ляцеў з каляскі,
Насіў шышкі, як каўбаскі.

Рассякаў калені, бровы,
Недапад быў, адным словам.
Дзве аперацыі ён знёс,
Хапіла маці гора, слёз.

Цікавіўся ўсім сусветам,
Пытанні сыпаў бацьку, дзеду.
Дапытлівы ўдаўся хлапчук,
Мог заткнуць за пояс двух.

Вучыў урокі без прынукі,
Майстар быў на розны штукі,
Цяжкай працы не цураўся,
Ставіў мэту і змагаўся.

Не спадзяваўся ні на кога,
Сам выбіраў сваю дарогу,
Грызам грыз ангельску мову,
Жыць хацеў хлопец па-нову.

Цыгарэты і наркоту
Не падносіў ён да рота,
Смаку не ведаў і гарэлкі,
Таму кахалі Васю дзеўкі.

А ён дзянёчак у клапоце
У інстытуце, на рабоце,
Пісаў артыкулы ў газету,
Круціўся хлопец-непаседа.

Вучобу скончыў паспяхова,
Атрымаў аж два дыпломы,
Перакладчык, бакалаўр,
Чаго хацеў, таго дапяў.

Цяпер усё было да толку,
Веды ёсць, варыць галоўка,
Шукай працу, прымяненне
Для поўнага задавальнення.

Толькі інакш думаў Васіль,
Адкрыта неяк заявіў:
— Як ты хочаш сабе, маці,
Не буду працу я шукаці.

Жадаю быць гаспадаром,
Ды не зусім яшчэ гатоў.
Таму далей трэба вучыцца,
Каб у жыцці чаго дабіцца.

Як сказаў, так і зрабіў:
У магістратуру паступіў.
Набыў веды і стаў дока,
Марыў і глядзеў далёка.

Выбраў долечку не з лёгкіх,
Кожны дзень, як у палётах.
Хоць бы адпачыў хвілінку...
Знайшоў сваю палавінку.

Так я думала, бывала,
Не раз сына папракала:
— Ты запаволь, дзіцятка, тэмп
І выберы лягчэйшы хлеб.

Мацеры паслухай словы,
У мяне ж вопыт жыццёвы,
Я сябе не шанавала,
Здароўе рана падарвала.

Непаслухмяны стаў сынок
І ўцякаў з хаты знарок,
Я паціху адступала,
Дзень і ноч перажывала.

Аднойчы заявіў Васіль:
— Хацеў бы я пажыць адзін,
Буду купляць сабе жытло,
Каб там спакойна мне было.

Спраўдзіў усё мой каласок,
Цудоўны прыдабыў куток,
Яшчэ скажу вам па сакрэце:
— Жонку знайшоў па інтэрнэце.

Завуць маю нявестку Насця,
Дай ім, Божа, з Васем шчасця,
Здароўя, радасці, дастатку,
На працы поспеху, парадку.

Няўрымслівы наш забіяка
Нарадзіўся ў знаку Рака.
Сёння плануе шмат чаго,
Сам дабіваецца ўсяго.



Сын Васіль і нявестка Насця, 2006 г.

У буднія дзянькі на працы,
Выхаднымі — на рыбалцы,
Праедзе не адну гравейку,
Віхрам дамчыцца да Вілейкі.

Аж у Стаўрове прыкіпеў,
З Насцяю дамок купіў,
Для сваёй сям'і, бацькоў
Санаторый — будзь здароў!..

За Браславам усе азёры
Фанату нашаму не новы,
Ловіць самоў і шчупакоў,
Румяных тоўстых акунёў.

Сам не любіць рыбу есці,
Раздае маці і цешчы,
Смакуйце, наталяйце губкі,
Ад Васі вам дарунак, продкі.

Відаць, удала далі імя
Свайму малодшаму мы сыну,
Тры дзесяткі наш сынок
Цвіце, бы ў жыце васілёк.

Я нос не ткну ў жыццё сына,
Беражэ хай анёл мілы.
Праўда, ёсць жаданне ў маці:
Дачакацца дзетак Васі.

Можа б, маленькія «стварэнні»
Былі сыночка прадаўжэннем,
Галубіла б я немаўлят,
Як ластавачка птушанят.

Сын і мяне не забывае,
Праблемы вострыя рашае,
Жыві, матуля, у поўным шчасці,
Ганарыся сваім Васем.

Я кожны дзень гэта раблю,
Цаню сыночка і люблю,
Здароўя, шчасця і надзей
Яму жадаю ў юбілей.

Схіліце галаву над імі!

Памяці юнага партызана
Анішкевіча Канстанціна Мікалаевіча

Прыходзіць ліпень, а з ім свята
Ступае ў нашы мірны хаты,
Дзень вызвалення, дзень жаданы
Напамінае нам пра раны.

Няма, напэўна, той сям'і,
Дзе б не крывавілі яны,
Вораг, жудасны і страшны,
Паліў усё агнём нязгасным.

Гарэлі дзеці і жанчыны,
Дзяды і сталыя мужчыны,
Па-звярынаму, без сэрца
Людзей знішчалі каты-немцы.

Хацелі сцерці нас з зямлі,
Каб мы ніколі не змаглі
Устаць з калень, прадоўжыць род,
У глебу кінуць шчодры плод.

Таму паўсюль у Беларусі
Гуртаваліся ўсе людзі,
Сцякалі кроўю — не здаваліся,
Мужна з ворагам змагаліся.

Ад старога і да малога
Кавалася ў нас перамога,
Хто як мог, так ваяваў,
Вызваленне набліжаў.

Фашысты вельмі пралічыліся.
Байцы са стратамі адбіліся.
Сілы і мужнасці хапіла
Акупантам заткнуць рыла.

З расказаў продкаў уяўляю,
Што зямля наша хавае...
У маладым вяку і сіле
Людзей нямала палажылі.

Кожны трэці рукі склаў,
Кожны трэці знік, прапаў,
Іх зорка ясная пагасла,
Не зведаўшы кахання, шчасця.

Не буду плакаць, галасіць,
Хачу ў паэме ўваскрасіць
Вобраз падлетка-партызана,
Які загінуў вельмі рана.

Непадалёку, каля Мінска,
Юхноўка ёсць ля Гарадзішча.
Звычайная, па-мойму, вёска,
Там і жыў хлапчына Косця.

Бацька звaўся Мікалаем,
Будаўнік, сталяр удалы,
Штодзень на золку ўставаў,
На хлеб сямейцы зарабляў.

Быў гаспадар не абы-які.
Чуць не папаў на Салаўкі,
Узялі хаціну і скаціну,
Зямлі апошняй дзесяціну.

Хапіла й мацеры спаўна,
Аўдоцця ў працы век была,
На раду адны мужчыны,
Не прынёс бусел дзяўчыны.

Старэйшым быў сын Канстанцін,
Пад ім яшчэ трое хлапчын,
Я вобраз Косці ўяўляю,
Бо Міколу, брата, знаю.

Ён мне паведаў, расказаў,
Што сабой Косця ўяўляў,
Якім запомніўся хлапчына
Да таго часу, як загінуў.

Таму рашу сёння задачу,
Вам партрэт Косці азначу:
Тварык смуглы, бледнаваты,
Носік крышачку кірпаты.

Малыя чорненькія вочкі
Гарэлі, нібы вугалёчкі.
Позірк адкрыты, ясны, светлы,
Шчыры, наіўны і прыветны.

Рамантык, фантазёр нястомны,
Адчайны, смелы і няўлоўны,
Яго несла і круціла,
Бы хтосьці ўставіў матавіла.

Без дазволу, без прынукі
Вытвараў розныя штукі,
Неяк скокнуў у машыну
І на тыдзень дом пакінуў.

Не хацеў сядзець за партай,
Няўрымслівы дзяцюк, упарты,
Заўжды была ў яго праява
І важная цягнула справа.

Любіў ён кнігі, шмат чытаў,
Іншы раз ночы не спаў,
Нават чытаў з сынам і тата
«Дзеці капітана Гранта».

Мікола, Дзіма, меншы Алік
Любілі, што такі ў іх брацік,
Ён жа заступнік і апора,
Бо па калені Косцю мора.

Бацькі заўзята працавалі,
А дзеці ім дапамагалі,
Рвалі травіцу на балоце,
З ранку да вечара ў рабоце.

Дровы рэзалі, складалі,
Кароўку ў поле выганялі,
Смажылі на агні сала
І гулялі ў кучу малу.

Косця працаваў на ферме,
Праца цяжкая не ў меру,
Але цярпеў усё і зносіў,
З дзяцінства хлопец быў выносліў.

Цешыла бацькоў дзятва,
Падмога моцная была,
Чатыры сыны — сакалочкі
Раслі хутка, як грыбочкі.

І вось такі сямейны лад
Растаптаў фашысцкі гад.
Змяніліся планы і мары,
Трэба змагацца ад навалы.

Цяпер для Косці быў размах,
Па баку журба і страх,
Трымаўся на пярэднім плане,
Папаўняў свае пазнанні.

Не спускаў з ворага вока,
Штосьці планаваў далёка,
Падбіраў боепрыпасы,
Меў нядрэнныя запасы.

Здабыў нават кулямёт
Адважны юны патрыёт,
Рыхтаваў сябе да помсты
Немцам-гадам невыносным.

Напралом лез да байцоў,
Пайсці з імі быў гатоў,
Адвозіў раненых у тыл,
Аж курэў з-пад колаў дым.

Аднойчы дзеці напаткалі
Лейтэнанта ля канавы,
Аб гэтым нашапталі тату
І, вядома, Косцю-брату.

Той, як віхор, выскачыў з хаты,
Не пачакаў, што скажа тата,
Рвануў кустамі да канавы
Не для дзіцячае забавы.

Там аказаўся камандзір,
Паранены, аслаб зусім,
Ад болю курчыўся, стагнаў,
Сілы апошнія губляў.

Косця ўсё зрабіў да толку,
Перавязаў яму галоўку,
Добра, што была ў хлапца
Хоць стужка чыстага бінта.

Падаспеў якраз і тата.
А як стала цемнавата,
Камандзіра перанеслі
У пустую хату Тэклі.

Камандзір хутка ачуняў,
Бо яго Косця даглядаў,
Часта шаптаўся з ім уночы,
Задумаў, мабыць, хлопец штосьці.

З Кашынскім сябраваў Зянонам
І Лютарэвічам Антонам,
У свой гурт Косцю прынімалі,
Хоць маладзейшы — не зважалі.

Усё, што назапасіў Косця,
Цяпер хавалася ў возе,
Коні бралі ў лес кірунак,
Везлі мсціўцам падарунак.

Вяртаўся хлопец на світанні.
Ну й хапала тады маме!..
Хіба магла Аўдоцця спаці,
Калі няма сына ў хаце?

Аднойчы хлопец не вярнуўся.
Сусед сказаў: «Косця падаўся...
Аж за Палік, аж за Барысаў,
Вам прывітанне толькі выслаў».

Сям'я не знала вельмі доўга,
Як склалася ў хлапца дарога,
Толькі праз год забег дадому,
Каб з'есці місачку булёну.

Цяпер Мікола, брацік меншы,
Стаў Канстанціну сябрам лепшым,
Туляўся ля ялін і сосен,
Адзенне, ежу ў лес прыносіў.

Маці пякла духмяны хлеб
Лясным ваякам на абед,
Збірала сякі-такі скарб,
А Мікалай насіў у атрад.

Косця стаў прыгожы, рослы,
Паглядзіш — хлапец дарослы,
А яму ж толькі пятнаццаць,
Ды трэба з ворагам змагацца.

Вайна была ў самым разгары.
Немцы звярэлі, лютавалі,
У Трасцянцы і на Шырокай
Дым валіў аж пад аблокі.

Гарэлі там дзеці і маці,
Іх не змаглі ўратаваці,
Лёс быў такі і ў таты Косці,
Знаць бы нам, дзе яго косці.

Ён сыну-мсціўцу памагаў,
А здраднік бацьку апазнаў,
Далажыў усё фашыстам,
Заўчасна чалавека знішчыў.

Асіраціў Аўдоццю, дзетак,
Ірад рыжы, недаедак.
Хай род яго апруцянее,
На жыццё страціць надзею!

Цяжэй за ўсіх прыйшлося Косцю,
Вызваліць бацьку не ўдалося,
Нават няма яго магілы,
Дзе б галаву сыны схілілі.

І далі клятву ці зарок
Бацькаў памятаць урок:
Мужна з ворагам змагацца,
Жывымі ў лапы не здавацца.

Як вытрывала толькі маці
Страту мужа, дзяцей бацьку?
А каля рук чацвёра дзетак,
Сіротак мілых, малалетак.

Не па гадах Косця сталеў,
Першым у бой стралой ляцеў,
Смела гайсаў да маяка,
Часта прыводзіў «языка».

Прасіліся да справы рукі,
Поўз па-пластунску да чыгункі,
Узрываў масты і эшалоны,
Шугалі полымем вагоны.

Цяпер яго ўжо не ўтрымаць,
За бацьку прагнуў ваяваць,
За сіроцкую нядолю,
Краіну любую і волю.

Чацвёрты годзік ваявалі,
Душагубы ўжо пазналі:
Не пакарыць ім наш народ.
Тут кожны кусцік, кожны дот

З нянавісцю ў іх бок страляе,
Дзень перамогі набліжае.
Самкнуцца хутка ўсе франты,
Дадуць фашысты лататы...

Зямля стагнала, пяклі раны,
Баі вяліся нечуваны,
І пераможны горды марш
Зрабіў, нарэшце, свой рэванш.

Група варожых армій «Цэнтр»
Разбіта ўся была ўшчэнт,
А аперацыя «Баграціён»
Вядома і дзецям нашых дзён.

На зямлі мужнага народа
Трыумф спраўляла Перамога,
Загнала ворага ў «кацёл»,
Як у вогненны касцёр.

Тут мсціўцам поўнае раздолле,
Сцягнуліся з лясоў і поля,
Кожны кавалачак зямлі
Адваёўвалі яны.

Крушылі рэйкі і масты,
Гарнізоны і штабы,
У сёлы, горад пранікалі,
Перад сабой фашыстаў гналі.

Брыгада Косці наступала,
«За Беларусь» сябе назвала,
Вядомай была, моцнай, смелай,
Павагу ў народа мела.

У Вінакуравым атрадзе
Не было панадна здрадзе,
Тут хлопцы ўсе як на падбор,
Р'яна бралі кожны двор.

Нахрапам лез наперад Косця,
Каб паламаць фашыстам косці.
Так выйшла і на гэты раз,
Калі атрад праводзіў марш.

Напрасіўся хлопец сам,
Ад камандзіра не адстаў,
Той мусіў Канстанціну здацца,
Дазволіў яму запісацца

Добраахвотнікам у групу,
Атрад ахоўваць толькі збоку.
Калі што — паведамляць,
На сябе ўдар не браць.

Немалы прайшлі ўжо шлях,
Як раптам нечакана «бах!»...
Засада ворагаў прад Косцем,
Нібы якраз чакала госця.

Завязаўся бой няроўны,
Грымелі выбухі смяротны,
Косця вопыт ужо меў,
Таму прад немцамі не млеў.

Ён папярэдзіў свой атрад.
І з крыкам: «Беражыся, гад!»
Кулі пускаў беспамылкова,
Складалі нелюдзі галовы.

На жаль, паранен быў хлапчына,
Можа, дзе й плакала дзяўчына,
Заўчасна адцвіў, як дзьмухавец,
У шаснаццаць год Косця-баец.

Каб медык быў тады на месцы,
Не даў бы Косценьку памерці,
Хлопец сцёк увесь крывёю,
Было раненне ракавое.

Загінулі й яго сябры,
Цудоўныя хлопцы былі,
Зянон, Тонік і Гвідон
Не дажылі да светлых дзён.

Пад плакучай густой івай
Герояў юных палажылі,
Сябры масцілі ім пярыну,
Зямельку кідалі ў магілу.

Хай будзе пухам ім яна,
Хлопцы змагаліся спаўна,
За нашу родную Айчыну
Дачасна кожны з іх загінуў.

Ні маці, ні браты не зналі,
Дзе Косцю і сяброў хавалі,
Таму, як знойдзеце магілы,
Схіліце галаву над імі!

Нарвіце васількоў у жыце,
Героям-мсціўцам падарыце,
Хай удыхнуць хоць водар кветак,
Спелых жытоў, родных палетак.

Мы не маем сёння права
Забыць загінуўшых, іх славу,
Бо толькі дзякуючы ім
На зямлі вольнай стаім.

Ізноў я ў дарозе-пуціне

Мудрай і слаўнай жанчыне,
шчырай і шчодрай прыяцельцы
Валянціне Пятроўне Сямёнавай



Злева направа: Ніна Кісялёва і Валянціна Сямёнава, 2008 г.

Ізноў я ў дарозе-пуціне,
Не сядзіцца кабеціне дома,
На гэты раз к Валянціне
Пралегла мая дарога.

Мезінаўка. Край маляўнічы,
Кут гонкіх хвой і ялін,
Чую: макушамі шэпчуць увысі:
— Тут Колас пісаў і хадзіў.

— Я ведаю, мілыя дрэўцы,
У школе пра гэта чытала,
Цяпер скажу шчыра, нарэшце:
Прыгажосці такой не ўяўляла.

Пад сховаю пушчавых вех
Сотні казак, легендаў, паданняў,
Услухайся ў шум баравы, чалавек,
Тут знойдзеш ты скарбы, пазнанні.

Да дачы Пятроўны не блізка,
Вярсты, пэўна, тры яшчэ пешшу,
Цалуе твар, вочы крылаты вятрыска,
І сонца на захадзе цешыць.

— А вось і куточак мой любы!—
Валянціна Пятроўна сказала.
На сцежку направа, бліз ліпы і дуба,
Кіўком галавы паказала.

І бачу: між сосен, як тыя грыбы,
Адна за адной невялічкія хаткі,
Разнастайныя кветнікі, дрэўцы, кусты,
Усялякай гароднінай поўныя градкі.

Цяплічкі блішчаць каля хат,
Там спеюць, відаць, памідоры,
Невялікі на ўчастках размах,
Затое тут думкам прасторна.

— Вось там, ля апошняга слупа — мая,—
Паказала Пятроўна на хату,—
Тут мне спакойна, шкада, што адна,
Міла, дорага ўсё, хоць не багата.

— Цудоўная хатка!— кажу Валянціне.—
Не горшая, чым у суседзяў,
Па-мойму, тут проста, гасцінна,
Таму і да вас усе едзем.

— Добры вечар!— вітаю хаціну,
Праходжу ў пакой, адчуваю, бы дома,
Гаспадар з фотаздымкаў страчае чулліва,
Цудоўную аўру стварае Пятроўна.

Неўзабаве вячэра ўжо на стале,
Гаспадыня ля госці шчыруе,
Дастае ўсе запасы, прысмакі свае,
Ад душы запрашае, частуе.

Гамонку з Пятроўнай вядзём дапазна.
Найболей яе ўсё ўспаміны,
Як будаваліся, з Генкам жыла,
Суджаным, любым, навекі адзіным.

Вобразы, кадры мільгаюць,
Знаёмяць з такім дарагім,
Цікавяць, глыбока кранаюць,
Вядуць пераклічку з жыццём маім.

У вокны світанак пачаў падкрадацца,
А нашай размове канца не відаць,
Як хочацца часам паспавядацца,
Каб смутак на сэрцы суняць.

Прачнулася раніцай, выйшла ў двор,
Цішыня. Анямеў бор вячысты,
Лёгкакрылы вятрыска заціх і замёр,
Не чуваць спеву птушак і свісту.

Ліпень на сходзе, песні адпеты,
Верас ліловы цвіце ў бары.
— Ніна Іванаўна! Дзе ты?
Снедаем хуценька і па грыбы.

А снеданне ў Валі... Божухна мой!
Зроду не ела такой смакаты!
Варэнікі з вішнямі і тварагом,
Мяці хоць за абедзве шчакі.

Натаптаўшы жывот да адвалу,
Нацянькі падаліся ў сасняк,
Пятроўна ўсе ведае сцежкі, завалы,
А я не магу разабрацца ніяк.

Таму раз за разам гукаю,
Баюся зблудзіць незнарок,
Бы кнопкі, лісічкі-сястрычкі зразаю
І крышку ад Валі адходжу ўбок.

Блішчаць там на сонцы чарнічкі,
Як пацеркі, радуюць сэрца і вочы,
Гэта, пэўна, упалі сатлеўшыя знічкі,
Што ярка гарэлі сёння ўночы.

Люблю, ганаруся табою, лясок,
Даражу хараством і багаццем тваім,
Дзесьці івалгі чую яшчэ галасок,
Нібы флейта дзядулі, на слыху маім.

— Ніна Іванаўна, пойдзем дамоў!—
Валянціна Пятроўна сказала,—
Суха ў лесе, мала грыбоў,
Дарма толькі вас я пазвала.

— Вы не правы, Валянціна Пятроўна,
Не сабралі грыбоў і не трэба,
Адчуваю сябе я тут вельмі цудоўна,
Бяскрайнім любуюся борам і небам.

Паветра ўдыхаю на поўныя грудзі,
Свежасць яго ап'яняе галоўку,
Хай па грыбы ходзяць іншыя людзі!—
Сказала прыяцельцы гучна і бойка.

Абгайсаўшы паляны, разлогі,
Дадому пляліся паціху, памалу,
Паабедалі, крыху паспалі з дарогі,
Ахвотна ўзяліся за хатнія справы.

Вёдрамі носім гуркі, памідоры,
Марынуем і солім спрытна і лоўка,
Ураджай як ні ў кога, напэўна, ніколі,
Працавала старанна Валюша, як пчолка.

Часнок і цыбульку-сямейку сабралі,
Усяго тут хапае спаўна,
Гаспадарчы разлік, назіранні
Валянціна Пятроўна вяла нездарма.

Аплачана праца, вынік багаты,
Здзіўляе і цешыць ўсіх агарод,
Нялішне зямелькі ля Валінай хаты,
Але накарміць не адзін хопіць рот.

Інакш і не можа тут быць,
Сама гаспадыня гэтага варта,
Умее нястомна помніць, любіць,
Завіхацца да сёмага поту ўпарта.

— Праца — не воўк, у лес не ўцячэ!—
Валянціна Пятроўна прамовіла шчыра.—
У мяне ёсць сягоння задума яшчэ:
Сябровак сваіх сабраць на вячэру.

Пабачыце! Што за жанчыны!
З імі мне жыць весялей,
Гэта скарбы нашай Радзімы,
Адна за другую мудрэй і мілей!

Таму мыем хуценька рукі,
Бо сонца на сосны сядае,
Шашлыкі бяру я на парукі,
Астатняе вам даручаю.

На скорую руку складаю меню,
За бульбачку перш, за салаты,
Зяленіва болей цяпер ў хаду,
Не лянуйся прайсціся ў грады.

Вось і Людміла Васільеўна тут,
Адразу ўключылася ў справу,
Немец сказаў бы: «Frau gut-gut!»
А па-нашаму: хораша! Спраўна!

Адкрыты і шчыры пагляд,
Гарыць у руках работа,
Як быццам я знаю яе многа год,
А бліжэй пазнаёміцца з Людай ахвота.

— Штосьці дацэнтшы нашай няма,—
Трывожыцца ўслых Валянціна.—
А...На лёгкі ўспамін і яна,
Алька, сяброўка мая, Аляўціна.

Бачу: жанчына заходзіць у хату,
Вітаецца гучна, заводзіць гамонку,
Калісьці дасціпнай была, зухаватай,
Цяпер жа турбуе штось Валі сяброўку.

Пра гэта мне стала вядома,
Калі Аля назаўтра прыйшла,
Цудоўна жылося б, без стомы,
Толькі, на жаль, здароўя няма.

Але ўсё-такі вернемся мы да стала,
Які гнуўся ад страў самабытных,
Вячэра ўдалася, кіпела, гула,
Знікала гара шашлыкоў сімпатычных.

Пяром не апішаш, не скажаш таго,
Што дзеялі ў зорны той вечар,
Смакавалі патрошкі ў кубках віно,
Выразна чыталі любімыя вершы.

Вы б бачылі воблік і вочы жанчын!...
Іх душы нястомны, багаты!
Знайшлі б, пэўна, сотню прычын,
Каб пайсці да каторай у сваты.

Гучаў Ісакоўскі, Ясенін і Блок,
Сіманаў, Пушкін, Ахматава.
Хай здароўе дае вам, жанчыначкі, Бог,
Каб шчаслівы былі вы, ніколі не плакалі.

Чытала і я паэмы і вершы
На роднай матулінай мове,
Яна прарасла ў маім сэрцы,
Люблю, ганаруся я ёю.

Без песень у нас не абышлося,
Ну як жа так жыць — не спяваць,
Нам кожнай у жыцці даставалося,
Але трэба форс свой трымаць.

Спявалі ўсе зладжана, ва ўнісон,
Найбольш пра спатканні, расстанні,
Не браў у палон нас і сон,
Хоць у вокнах займалася ранне.

Праўда, трошкі прылеглі на золку,
Спаць прасіліся вейкі і вочы,
А ў сэрцы цвілі, бы вясёлка,
Радасць, уздым ад цікавай сустрэчы.

Удзень у пасёлку, напэўна, гуло,
Абмяркоўвалі нашы лірычныя песні,
Бо, як у даведачнае бюро,
Ішлі к Валянціне Пятроўне суседзі.

Заняўшыся крышачку справай будзённай,
Плануем ізноў, як нам вечар правесці,
Аж звоніць Людміла: «Чакаю вас сёння!
Будзем спяваць караокі ўсе песні»

— На возера зойдзем заадно,—
Сказала з усмешкай Пятроўна,—
Вадзіца там чыстая, свеціцца дно,
Толькі, пэўна, купацца ўжо позна.

У Васільеўны чынна сядзім за сталом,
П'ём з травамі смачну гарбату,
І караокі гучна пяём,
Аж ходарам ходзіць уся хата.

На гэты раз позна не бавілі час,
Не спалі ж мінулую ночку,
Па-мойму, да поўначы дома якраз,
І залеглі ў мёртвую спячку.

Назаўтра ў горад сабраліся мы,
Патрэба ў нас важна, адказна,
У Валянціны Паўлаўны імяніны былі,
А мы ж там персоны важны...

Дзякуй лёсу, бліжэй я пазнала Пятроўну,
Яна мяне ўзрушыла, узбагаціла,
Гісторыі кладзезь, цікава, прыстойна,
Дай ёй, Божа, здароўе і сілы.

Да сустрэчы, бывай, люд і кут!
Буду здарова-прыеду ізноў,
Ты мне спадабаўся і люб,
Толькі трэба ў сталіцу, дамоў.

Прыйшоў наш час...

Пілот Вано ў Сочы прыляцеў,
Там цудоўна адпачыць хацеў.
Купіў пуцёўку дарагую,
Здароўе ён сваё шануе.

Паставіў мэту: пляж штодзённа,
Пакуль не знойдзецца мадонна,
Што замяніла б жонку Кацю,
Якая дома з сынам Васем.

З усіх мужчын ён выдзяляўся,
Дзяўчатам ветліва ўсміхаўся,
Купаўся смела ў марскіх хвалях,
Быў спрытны, лоўкі ў забавах.

Аднойчы скочыў Вано ў мора,
Засцярог дзеўку ад гора,
Бо яе хваля падхапіла
І ледзь на дно не апусціла.

«Русалку» вынес, адкачалі,
Людмілай беларуску звалі.
Няўмелая была плаўчыха,
Каб не Вано, пазнала б ліха.

Калі ад стрэсу адышла —
Мадонна перад ім была.
Не марыў ён другога шчасця,
А Людміла была ўдзячна.

Заляцацца наш герой умеў,
Не хваліўся — проста оды пеў:
— Вано завуць, наш знатны род,
Ваджу ваенны самалёт.

Маю катэдж, купіў машыну,
Сваю шукаю палавіну.
Даўненька за табой цікую,
Хацеў бы мець толькі такую.

Ты мая зорка, маё сонца
І ярка свеціш мне ў аконца,
Адну цябе, радасць, цаню,
Кахаю вельмі і люблю.

Жыву ў Грузіі, у сталіцы,
Хачу з табою ажаніцца,
Не згодна — выпрашу ў неба,
Адмаўляць, Люда, не трэба.

У хаце будзеш гаспадыняй,
Цябе палюбіць маці, прыме,
Атрымае маю вестку —
Нібы дачку, стрэне нявестку.

Хадзем зірні, дзе я жыву,
Шыкоўна ў люксе, не хлушу.
Куплю цукерак, вып'ем кавы,
Прыемна будзе і цікава.

Як рыбка, клюнула Людміла.
Такіх прызнанняў і не сніла.
Вось дзе сапраўдны, відаць, франт,
Як можна не паверыць? Як?

Цукеркі ела, піла каву,
Усё было вельмі цікава.
Смакавала каньяк, віны,
Думала: Вано адзіны...

— Хопіць нам хадзіць на пляж,
Адпачні са мной, прыляж.
Купацца, мілая, даволі,
Ледзь не наелася ты солі.

Так спяваў Люсі Вано,
А ёй аж дух пераняло.
Наіўна плюскала вачыма,
Даверліва была дзяўчына.

Пазваніла маці й тату:
— Прыеду не адна я ў хату.
Будзе ў вас цудоўны зяць,
З Тбілісі родам, Вано зваць.

На працы выхваляўся бацька:
— У мяне Люся!.. Вось дзіцятка!..
Такое шчасце Бог паслаў!
Знайшоўся той, каго чакаў.

Гатова й маці да сустрэчы.
Якраз рамонт дома дарэчы.
Не жарты мець такога зяця,
Шавяліся хутчэй, Насця!..

На золку заштарміла мора.
Нібы прыбіла дзеўцы гора:
Не было мілога ў люксе.
Што ж рабіць бядняжцы Люсі?

— Няйначай, ён пайшоў купацца.
У шторм нядоўга і расстацца.
Няўжо яго злізала хваля
Ці праглынула рыба злая?

Да дырэктара пабегла Люся.
— Яна, напэўна, будзе ў курсе.
Каму ж тады знаць, як не ёй.
Ой, горачка маё, ой-ой!..

Дырэктар дзеўчыне сказала:
— Нічога страшнага не стала,
Дамоў падаўся на світанні,
Даў сувенір на развітанне.

Шкада, папалася ты, рыбка,
Ды не гаруй, не плач, Людмілка,
Ва ўсіх Вано мода такая:
Заманіць дзеўку — і знікае...

Людміле белы свет не міл.
Паехала б услед за ім,
Ды адрасу яго не знала.
Чаму раней не запытала?

Набрала нумар тэлефона,
Абанемент маўчаў, вядома.
— Як скрозь зямлю ён праваліўся,
Лепш бы марской вадой заліўся.

Я б шчаслівейшаю была,
Каб мяне хваля знясла.
Дык не — з'явіўся ратаванец,
Нахабны франт і ашуканец.

Толькі Вано ўжо не да Люсі:
Поезд ля роднага Тбілісі.
— Праз пяць хвілін будзе сталіца!—
Сказала гучна правадніца.

Апошні тармазнуў вагон,
Вано памчаўся на перон,
Яго страчала жонка Каця
І трохгадовы сынок Вася.

Як клапатлівы муж і тата,
Падарункаў меў багата.
Хваліўся: «Эх, адпачываў!
Толькі па родных сумаваў.»

Уначы прысніўся яму сон,
Што папаў у яго сеці сом,
Вано ад радасці ўсміхнуўся,
Спрасонку крыкнуў: «Люся! Люся!»

Пачула гэта жонка Каця,
Як мора заштарміла ў хаце:
— Ізноў круціў там шуры-муры,
Бо клікаў нейкую фігуру...

Больш не паедзеш ты без нас.
Лепш будзем есці хлеб і квас.
Калі на мора — усёй сям'ёй,
Каб мне не жыць потым адной.

— Цішэй ты, мілая Кацюша,
Люблю я вас — і вельмі дужа.
Не трэба так зранку злавацца,
Цябе чакае сын і праца.

Пасябраваў я ў адпачынку
З Іванам, які быў з дзяўчынкай.
Зваў яе ён Люся! Люся!..
Таму ў сне я так звярнуўся.

Паверыла, прыціхла Каця,
Павяла ў яслі – садзік Васю,
Вано ж успомніў дарагусю,
Крыху сумеўся і жахнуўся:

— Брыдка зрабіў, не развітаўся,
Зманіў і зганьбіў, насмяяўся.
Наіўная рыбачка Люся,
Я нават за яе баюся.

Стрэс Люся цяжка перанесла.
Ледзь не ў зямлю жывая лезла.
Усёй душою пакахала,
Хлусні Вано не адчувала.

— Бяду сваю я ў сэрцы затаю,
Маме і тату праўду не скажу.
Здароўя ў іх зусім няма,
Як-небудзь спраўлюся сама.

Дырэктар шкадавала Люсю:
— Дзяўчо! Дапамагчы я мушу,
Дам Вано каардынаты,
Вазьмі і едзь да яго таты.

Закон у аксакалаў строгі,
Саб'юць яны сыночку рогі.
Скажы яму пра сваю скруху,
Можа, разжаліш і свякруху.

— Дзякуй вам, — сказала Люся,—
Ды лепш я ў моры ўтаплюся.
Не варта бацьку турбаваць,
Трэба Вано як забываць.

Вяселле пад прымусам таты...
Навошта мне такія жарты?
Я і сама гэту бяду
З часам агараю, знясу.

Бацькам скажу: Вано ўтапіўся,
Навекі з морам парадніўся.
А цяпер дам тэлеграму:
Лячу адна, тата і мама...

Сустрэлі Люсю маці, бацька,
Пра ўсё хацелі распытацца,
Чаму адна? Дзе дзеўся зяць?
Схуднела ўся, вочы блішчаць,

Слязой напоўнены да краю.
Здаецца, вось-вось — і сканае...
Не вытрымала, праўда, маці,
Балела сэрца па дзіцяці.

Дачку паціху распытала:
— З табою, Люсенька, штось стала?
Дзяліся, дзіцятка, са мной,
Я самы лепшы сябар твой.

Адкрыла тайну сваю Люся:
— За сябе, мама, баюся.
Вано я моцна пакахала,
Ды мора любага забрала.

Не пытай, мама, нічога,
Хай будзе светлая дарога...
Забыць яго мне памажы,
І больш нічога не кажы.

— Дачушка родная мая!
Як толькі ты перанясла?
Паляцела на адпачынак —
А вось які няшчасны вынік.

Бяда, Людмілачка, у нас.
Ды людзі кажуць: лечыць час.
На Бога будзем спадзявацца
І памаленьку забывацца.

Восень ужо не за гарамі,
У інстытут пойдзеш з сябрамі,
Трэба, дачушка, давучыцца,
Каб у жыцці чаго дабіцца.

А дні ішлі сваёй чаргою,
Люся спраўлялася з бядою.
Смачна ела, добра спала,
Усміхацца нават стала.

Але заўважыла раз маці:
Прыбытак будзе ў іхняй хаце.
Людміла дзіўна папаўнела
І налілася, пакруглела.

Хацела маці паўглядацца,
Пакуль нічога не пытацца,
Гадала: «Можа, мне здаецца?»
Але не вытрымала сэрца.

— Прызнайся, ластаўка мая,
Ці не чакаеш ты дзіця?
Пытанне Люсю як агрэла,
Ды не схаваеш, што ўжо мела.

— Што тут таіць, калі відаць,
Трэба грузінчыка чакаць...
Будзе сын у мяне хвацкі
Ад яго любага бацькі.

Помню Вано, не забываю,
І цяпер яго кахаю.
Хоць я і ўпарта, не плаксіва,
Забыць яго не маю сілы...

Выганіш — памогуць людзі,
А сынок у мяне будзе,
Я прысвячу яму жыццё,
Вось так, мамулечка, і ўсё...

Што гаварыць было матулі?
Хто ж Людмілачку прытуліць?
Каму патрэбен яе ўнук?
Будуць зваць дзіця байструк.

Маці ўздыхнула і сказала:
— Я толькі гэтага чакала.
Разумна ўсё, мая дачушка,
Няхай расце божая служка.

Цяжка будзе шавяліцца,
Унук і бабцы прыгадзіцца.
Я толькі падрыхтую тату,
Каб прыняў яго ў хату.

Матуля момант падабрала,
Навіну мужу расказала,
Бацька хацеў, каб быў і зяць,
Ды дзе ж яго цяпер узяць?

— Што мне рабіць? Прыму ўнука.
Толькі як з Люсінай навукай?
Кроў з носа, а закончыць трэба,
Веды не звaляцца ёй з неба.

— Ужо з дачкой мы гаварылі,
Відаць, удала парашылі:
Дзіця глядзець будзем пазменна,
Падсобіш ты, калі патрэбна.

Людміла да вучобы здатна,
Пяць курсаў толькі на выдатна,
Усё здала датэрмінова,
І доктар будзе адмысловы.

Незадоўга і хлапчына
Нарадзіўся ў дзяўчыны.
Люся была бязмежна рада:
Сыночак — выкапаны тата.

Галубіла сваё дзіцятка,
Памагалі мамка і татка,
Міколка рос як па заказу,
Усіх любіў, слухаў адразу.

Яшчэ ў дзяцінстве ён змірыўся,
Казаў: «Мой тата ўтапіўся».
Быў да вучобы хлопец здатны,
Узяў, напэўна, гены маткі.

Вучыўся ўсюды паспяхова,
Стрымаў прад маці сваё слова:
Пакараў прасторы неба,
Усё да толку, як і трэба.

Люся ў бальніцы працавала,
Праца хірурга — не забава,
Малыя і худыя рукі
Пазбаўлялі людзей мукі.

Шмат хто хацеў іх цалаваць,
Нізкі паклон доктарцы даць,
Любіць, кахаць, плячо падставіць,
Дуэт сямейны з ёй саставіць.

А ёй камфортна ў адзіноце,
Амаль што суткі на рабоце.
І даглядала бацьку, маці,
Слала лісты свайму дзіцяці.

Сын быў уважлівы, тактоўны,
Званіў, пісаў ледзь не штодзённа,
Прасіў сябе пашкадаваць,
Унукаў трэба дачакаць.

Неяк заўважылі калегі:
Трасліся рукі ў Люсі, млелі,
Асалавелі зусім вочы,
Напэўна, спала дрэнна ўночы.

Не ўтрывалі і спыталі:
— Іванаўна! Што сёння з вамі?
— Пакуль страшнага нічога,
У Душанбе мая дарога...

Заплакала і ледзь сказала:
— Сын у гарах Афганістана.
Зараз пайду ў ваенкамат,
Бо заключыць трэба кантракт.

Туды хутчэй, хлопцы чакаюць,
Надзеі, мары ўскладаюць,
Я буду доктар ім і маці,
Служыць, як роднаму дзіцяці.

Дакументы пазбірала,
Усё аформіла, сказала:
— Збірацца хуценька пайду,
Здаецца, чую я бяду.

Там сапраўды ўрача чакалі,
У аэрапорце сустракалі.
Вось, нарэшце, і шпіталь.
У палаты, доктарка, заглянь.

Там сябры твайго Міколы,
Амаль адразу пасля школы,
Не ўсе яшчэ, пэўна, кахалі,
А пораху ўжо паспыталі.

Пайсці ў палаты не ўдалося,
У аперацыйнай трэба Люся.
— Выпадак, на жаль, складаны,
Вялікія ў пілота раны.

Так ёй сказаў галоўны ўрач,
А Люся ў крык, а Люся ў плач.
— Скажыце, як імя хлапчынкі?
Няўжо мой сын, мая крывінка?

— Іванаўна! Будзьце спакойны!
Хірургу плакаць непрыстойна.
Пілот з Тбілісі. Зваць Вано,
Рыхтуйцеся! І да яго!..

Затрымцела ў Люсі сэрца:
— Імя Вано... Вано завецца...
Няўжо мой лёс, маё каханне
Зусім слабы і пры скананні?

Якраз тут звоніць тэлефон...
— Сыночак міленькі! Ён, ён!..
— Мама! У вас мой камандзір,
Ратуй яго, калі йшчэ жыў!..

Усё магчымае зрабі,
Толькі жыццё яму вярні.
Я прыклад браў заўжды з яго,
Люблю і даражу Вано...

Ён мне як бацька ці брат родны,
Гавораць: мы вельмі падобны.
Мая мілая мамуся,
За мяне ты не хвалюйся!..

Яе Вано і без сумнення.
Вось дзе здарэнне дык здарэнне...
Смерць аддала ў рукі Людмілы
Таго, хто быў ёй дораг, мілы.

Хоць на нагах ледзьве стаяла,
А бацьку сына ратавала.
Кроўю сэрца аблівалася,
Было цяжка — не здавалася.

— Той Вано, толькі бялюткі,—
Мільганула думка ў Людкі.—
Што скажа ён сыну і мне?
Што б ні сказаў, няхай жыве!..

Хірург стамілася зусім,
Ужо ля стала восем гадзін.
Медперсаналу не сказала,
Каго так шчыра ратавала.

Наркоз прайшоў. Вано спытаў:
— Хто мяне ўчора ратаваў?
Каму падзяку выражаць,
Што я змагу ізноў лятаць?

— Доктар на ранішнім абходзе,
Да вас абавязкова зойдзе.
Распраўце грудзі, вышэй плечы,
Гатовы будзьце да сустрэчы!

Якраз з'явілася Людміла.
На нейкі міг нібы застыла.
Тая ж усмешка, тыя вочы
Мора напомнілі і ночы.

Пабялела, пахіснулася,
Аднак пілоту ўсміхнулася.
— Добры вам дзень! — сціпла сказала,-
Я вас учора ратавала.

Такому сокалу патрэбна
Хутчэй узняцца зноў у неба!
Здаецца, доктар жартавала,
А сэрца грудзі разбівала.

Думала Люся: «Не пазнаў?
А, можа, віду не падаў?»
Успомніўся якраз і сын...
Макрэлі вочы ад слязін.

Каб не заўважыў Вано слёз,
З палаты выбегла на пост.
Хусцінку чыстую дастала,
Слязінкі горкія ўцірала.

Вано чакаў – прыйдзе мужчына.
А тут з'явілася жанчына.
Прыгожая, нібы мадонна,
Ужо ў гадах, але чароўна.

Толькі чаму так пабялела?
Заплакала, ледзь не самлела,
Цяпер сябе ён азадачыў:
— Па-мойму, доктара дзесь бачыў...

— Была ў вас Люсенька, пілот?
Глядзела рваны ваш жывот?—
Вано сястрычка запытала,
Не рада потым, што чапала.

— Люся! Люся! Божа мой!..
Як ты сустрэлася са мной!..
Вярніце доктара сюды,
Бо разарву ўсе бінты...

Вось дзе самкнуўся жыцця круг,
Я не дастойны яе рук!
Зляцеліся на крык Вано,
Гарачка, думалі, у яго.

Люся прыйшла і прашаптала:
— Сустрэчы я з табой чакала...
Вано! Не варта ўспамінаць,
Сабе праклянцці пасылаць!

Наш час, напэўна, яшчэ будзе,
А вы ў палаты хутчэй, людзі!
Я разбяруся сама з хворым,
Спакойна заўтра пагаворым.

Дамоў прыйшла, а там пісьмо.
Сын прасіў глядзець Вано:
— Ён цяпер зусім адзін,
Тут загінуў яго сын.


Жонка смерць сына не ўтрывала
І заўчасна рукі склала.
Абое вы патрэбны мне.
Я часта бачу вас у сне.

Хачу прыехаць у шпіталь,
Паказаць вам свой медаль.
Гарачы пацалунак вам,
Чакайце, хутка буду сам.


Людміла рада такой вестцы.
— Як толькі мне сябе павесці?
Сын не павінен знаць усё,
Што было ў мяне з Вано.

Хай думае, што пакахала
Адразу, як уратавала.
Заўтра дзяжурыць буду суткі,
Пра ўсё Вано скажу чысцютка.

Дамовімся, сустрэнем сына,—
Планавала так Людміла.—
Прыйшоў наш час, будзе вяселле,
А сын нам дасць благаславенне...



ВЕРШЫ





Ніна Кісялёва, 2009 г.

Дару сябе паэзіі

Дару сябе паэзіі,
І толькі ёй дару,
Адкрыта, без пампезнасці
Пішу і гавару.

Ёй давяраю думкі я,
Імкненні, парыванні,
Яна — збавіцелька мая,
Яна — маё прызванне.

Я з ёй страчаю летні дзень
І восеньскую ночку,
Яна — адбітак мой і цень,
А гэта відавочна.

Люблю яе, абагаўляю,
Як зорачку нябесную,
Аднаго толькі жадаю,
Каб загучала песняю.

Пішу сабе строгія ўказы...

Жыццё мяне не песціла ніколі,
Толькі слязінкам не даю я волі,
У ясна-сініх ім няма мясціны,
Хоць хапае болю і прычыны.

Спяваю, балагуру, весялюся,
Іншы раз расплакацца баюся,
Таму пішу сабе строгія ўказы:
Пазбаўляцца скрухі, як заразы.

Шукаць душы і сэрцу суцяшэння,
Сяброўскай згоды і паразумення,
Чакаць сустрэч, хвалюючых, прыемных,
Цёплых адносін, шчырых, узаемных.

Як мне цябе не хапае!..

Светлай памяці таты

Як мне цябе не хапае,
Апошні карэньчык мой!
Кватэра пустая, глухая,
Ад сцен павявае зімой.

За вокнамі спеў салаўіны
Не цешыць, не лечыць мяне,
Чаму ж ты, татулечка мілы,
Пакінуў мяне па вясне?

Расце, зелянее на ўзмежку травіца,
Пралескі цвітуць пад сасной,
І груша нібы маладзіца.
Любіў жа ты цешыцца ёй.

Прыгажосць!..Хоць карціны пішы!
Толькі вочы мае ў зацьменні,
Баліць рана ў самотнай душы.
Дзе знайсці мне гаючае зелле?

Як прывыкнуць, што ў хаце адна,
Каму расказаць мне навіны?
Што праглынуць, каб ліхая бяда
Не забрала апошнія сілы?

Парай жа, татулечка родненькі мой,
Хоць у ранішнім сне мне з'явіся!
Памаліся, душы перадай супакой
І скажы, як заўжды: беражыся, дачка, беражыся!..

Слядочкі

На золку прайдуся сцяжынкаю роснай,
Што стужкай віецца за вёскай,
Дзяцінства прыпомню, юнацтва ўзгадаю,
Мамы і таты сляды пашукаю.

Да лесу памкнуся, узыду на грудок,
Там брата, напэўна, убачу слядок,
Ён шмат іх пакінуў ля елак і сосен,
Грыбы сабіраючы ўлетку і ўвосень.

Хусцінку дастану, слядочкі збяру,
На покуці ў хаце сваёй пакладу,
І цешыцца буду, што я не адна,
Са мною найлепшая ў свеце радня.

Было б толькі ўсё там да толку

Падышла да хаціны, ступіла на двор,
Ніхто не сустрэў, не прывеціў,
Толькі дружнае, шчырае зумканне пчол
Мажорна гучала на квецені.

Цвіла алыча, слівы, вішні бялелі,
Гэта татавай працы здабыткі,
Яго рукі ніколі спакою не мелі,
Малы залатнік быў, ды прыткі.

Шмат зрабіў за жыццё, шчыраваў,
Пакінуў сядзібу патомкам.
— Хай раскашуюць,— не раз паўтараў,—
Было б толькі ўсё там да толку.

І мроіцца зноў успаміны...

Чатыры гадзіны. Не спіцца чамусь
У роднай бацькоўскай хаціне,
Бы ланцужкі павуціны, плывуць
Не забытыя мной успаміны.

Бывала, тут зранку кіпела жыццё,
Як пчолкі,гулі ўсе сядзібы,
Такім было блізкім і родным усё,
Што і сёння мне дорага, міла.

Спеў пеўняў, здаецца, аркестрам гучаў,
Мелодыі сэрца краналі,
Ражок пастуха неяк дзіўна пішчаў,
Статак збіраў на папары.

З комінаў змейкаю дым узвіваўся,
Надвор'е прарочыў, цяпло,
Тата з начлегу дадому вяртаўся,
І снеданне ў зборы было.

Бліны, нібы сонца, таўстушкі-аладкі
Спрытна кідала мама з патэльні,
Пах скварак, цыбулькі, мачанкі
Быў заўсёды гаючым нам зеллем.

Раз не сплю, устаю, на падворак іду,
Слухаю пошчак і шчэбет птушыны,
Зязюлю вітаю, лічу ўсе «ку-ку»,
І мроіцца зноў успаміны...

За вёсачку выйду, па сцежках блукаю
Пад Корань, Грамніцы, Пярэчнае,
Суцяшаю сябе, хоць сама даўно знаю:
І я тут, вядома, не вечная...

І толькі з вамі боль перанясе

Не здзіўляйцеся майму прыезду,
Гэта сэрца прывяло да вас,
У грудзях яму балюча, цесна,
Не гоіць і не лечыць нават час.

Загадаць маўчаць не маю сілы,
Не хоча пакарацца яно мне,
Да вас сцяжынка яму люба, міла,
І толькі з вамі боль перанясе.

Каб доўга нашчадкаў чакалі

Пакуль буду жыва, здарова,
Я вытапчу сцежку да вас,
Клады даглядаць мне не нова,
Здаўна так вядзецца ў нас.

Прыбяру, упрыгожу магілы,
Няхай цвітуць кветкі на іх,
Гэта сціплы дарунак ад Ніны
Для родных маіх, дарагіх.

Свечачкі ўсім запалю,
Прачытаю ўслых «Ойча наш»,
Як змагу, адслужу, дагаджу,
Толькі б спакой быў у вас.

На калені ўпаду перад вамі,
Аб адным шчыра вас папрашу,
Каб доўга нашчадкаў чакалі,
Не вярэдзілі сэрца, душу.

Я помню вас жывой

Памяці Людмілы Паўлаўны Канаш

Я сябе доўга дакарала,
Што не сказала вам «бывайце»,
Даруйце, Паўлаўна, не знала,
Што вас няма на гэтым свеце.

Таму я помню вас жывой,
Такой,якой былі вы ў нас,
Прыгожай, мілай, завадной,
Такой,як ведала я вас.

Бескарыснай і нязломнай,
Чулай да людскога болю,
Яркай зорачкай, натхнёнай
Для няўрымслівага Толі.

Настойлівай, адкрытай, шчырай,
Вясёлай, лёгкай на пад'ём,
І мне здаецца: вы ў вырай
Адляцелі ўвосень жаўруком.

Вы і там,пэўна,такая,
Іначай і не можа быць,
А мне ваш вобраз,дарагая,
Каб і хацела, — не забыць..

Бо абраз, што вы прынеслі
У нашу хату ў цяжкі час,
Як боская малітва, песня,
Напамінае мне пра вас.

Штодзённа перад ім малюся
За супакой вашай душы
І прашу пана Ісуса:
Нашчадкаў нашых беражы!

Быль Лагойшчыны

Тут ногі Купалы ступалі,
І горкія слёзы ліліся ракой,
Бо тату і брата, сястрычак хавалі
Пад замшэлай касцельнай сцяной.

Прайшло больш стагоддзя ўжо,
Зраўнялася, знікла магіла,
Забыліся ўсе на таго,
Хто даў нам Вялікага сына.

А сёння наогул не знаем,
Дзе продкі паэта ляжаць,
Магілы чужынцаў шукаем,
Не ўмеем сваіх шанаваць.

Няма ўжо касцёла даўно,
Спалілі яго партызаны,
Я знаю ад бацькі свайго:
Не было больш пякучае раны.

І ўлады тут сілу прыклалі
У шасцідзесятых гадах,
Ачысціць цвінтар загадалі,
Зняць помнікі — памяці знак.

Так і помнік Луцэвічаў знік,
Што паставіла маці паэта,
А ў сэрцах людзей жыве крык:
За што іх зняважылі гэтак?

Праўда, к стагоддзю Купалы
Пра бацьку ўспомнілі штось,
Прыехалі ў Корань, шукалі:
А мо йшчэ магіла дзе ёсць?

І хутка на ўзгорку, дзе вёсак клады,
Бацьку помнік чамусьці ўзвялі,
Старажылы казалі завезці туды,
Дзе бацькі і дзетак магілы былі.

Пра дзетак наогул размоў не ішло,
Ніякіх нідзе ўспамінаў,
А там жа, ля бацькі, іх трое лягло —
Казік, Гэля , Сабіна.

На гэтым атрэслі і склалі ўсе рукі,
Нікому няма больш тут справы,
А ёсць жа, напэўна, унукі, праўнукі
Магутнага дзядзькі Купалы.

Іх прадзед чакае даўно нездарма,
Углядаецца ўдалеч, сумуе,
Над ім жа калючы асот, крапіва
Горда з году ў год раскашуе.

Можа, гэтая быль хоць нашчадкаў кране,
Яны з'явяцца ў Корані нашым,
Гісторыя ў памяці люду жыве,
Клады продкаў мы іхніх пакажам.

Неслі святую Перамогу

Да 65-годдзя Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі

Быў летні вечар у разгары,
Як лебедзі, дзяўчаты ў пары
З хлопцамі важна танцавалі
І ўсіх наўкола чаравалі.

А вальсы Штраўса гучалі,
Вялі ў нязведаныя далі,
І мары , мары , іх надзеі
Цвілі ў душы, нібы лілеі.

Краналі сэрца дзіўны гукі
І не хацелася разлукі
З парою школьнай і шчаслівай,
Але бяда прыйшла лавінай.

Сатлелі ўшчэнт планы і мары,
У бой пайшлі супраць навалы
Бацькі,браты і нават сёстры
За наша шчасце,зімы,вёсны.

У перапынках між баямі
Байцы свой дом успаміналі,
Матулек родных, шанаваных,
Дзяўчатак мілых, закаханых.

Лісты пісалі, здымкі слалі,
Прасілі, каб іх прычакалі.
А кулямёт біў безупынку
За любых, сінюю хусцінку.

У час баёў нашы салдаты
Мужна змагаліся,зацята.
Іншы раз нявест страчалі,
Вяселлі там жа і гулялі.

І зноў спяшаліся ў дарогу,
Неслі святую Перамогу,
Сваім жыццём ахвяравалі,
Каб мы бяды, гора не зналі.

Мы рады адкрыцца душой

Вось і Гайна. Сустрэла сяброўка,
І Косця вітаў візіт мой,
Не моўкне, ліецца гамонка,
Мы рады адкрыцца душой,

Падзяліцца сваім набалелым,
Пра дзетак павесці расказ,
Аб тых, каго не сумелі
Жывымі ўтрымаць каля нас.

Усё аддалі б мы за тое,
Каб можна было іх вярнуць
У светлае жыццё зямное
І побач дыханне адчуць.

Убачыць лагодную ўсмешку,
Голас пачуць хоць здаля,
Прайсці ў садочак па сцежцы,
Якая не раз нас вяла.

Без іх адзінока і нудна,
Сэрца згарае датла ,
Дні працякаюць марудна,
Просіцца ў неба душа.

А розум яе не пускае:
— Не спяшайся дачасна ў неба!
Ты куды, мая дарагая?
Жыццё прадаўжаць тут патрэбна!..

А сэрцам адчуваю, нібы дома

Не ў сне, а наяву я ў Слабадзе,
У той мясціне, дзе прыемна мне,
Дзе дыхаю на поўныя я грудзі
І гасцінна сустракаюць людзі.

Найперш бягу, вядома, я да Томы,
А сэрцам адчуваю, нібы дома,
Як ластаўкі, шчабечам мы звычайна,
Душэўна дзелімся навінамі і тайнамі.

Тут няма радні — хай і не будзе,
Вакол мяне, як родныя, усе людзі,
Выяўна бачу: цешацца сустрэчай
І размовай шчырай, чалавечай.

У кожную хаціну — калі ласка,
Слабодцы ўсе гасцінны і запасны,
Прапануюць сыradой і мёд,
Хай трывае толькі мой жывот.

Удзячна ім, люблю і паважаю,
Шчасця, здароўя моцнага жадаю,
Пратэндую быць не проста госцем,
На большае надзею маю штосьці...

* * *

Мілая Белая Русь!
Табой даражу, ганаруся,
Тут продкаў маіх карані
Глыбока залеглі ў зямлі.

Я таксама карэнні пусціла,
Двух сыноў — сакалоў узрасціла,
Адкрыта табе заяўляю:
Не здрадзяць яны свайму краю.

Будуць верай і праўдай служыць,
Каб магла ты квітнець і жыць
У міры, дастатку і шчасці,
Была люба ўнучачцы Насці.

Елачкі-паненкі

Ля школы елачкі-паненкі
Пасталі хораша ў рад,
На іх цудоўныя сукенкі
І шышкі-пацеркі гараць.

Штодзень любуюся я імі,
Такой красы не апісаць,
Да елачак, як да святыняў,
Хаджу душу я суцяшаць.

Ківаюць лапкамі красуні
І шчыра гутарку вядуць,
Пэўна, чытаюць мае думы,
Парады слушныя даюць.

Перад Калядамі ў хаце
Гасцюе елачка заўжды,
Шчырую ля яе, як маці,
Дару цукеркі і шары.

З ёй сустракаю Новы год,
Заву паненачку сяброўкай,
І веру: дасць здароўе Бог,
Жыццё расквеціцца вясёлкай.

У гонар ночанькі музейнай

Ларысы Іванаўны прыемны галасок
Запрасіў на цуда-вечарок:
— Прыедзь да Коласа, у музей,
Там будзе сёння шмат гасцей!

Нядоўга думала, памчала,
І сапраўды — не прагадала,
Цікава ўсё было, цудоўна,
А сэрцу радасна, спакойна.

Сышоўся люд, увесь прыстойны —
Паэты, крытыкі дастойны,
На лаўкі селі ў двары,
А вакол цвілі сады.

Пчолкі зумкалі, гудзелі,
Апылялі дружна дрэвы,
Заліваўся салавей,
Цешыў песняю людзей.

Пачаліся прадстаўленні
У гонар ночанькі музейнай,
Найперш слухалі Курбеку,
Нарабіў дзівак нам смеху.

Ён новы твор прэзентаваў,
Вершы жартоўныя чытаў,
Міхась Міцкевіч слова меў,
Курбеку оду ледзь не пеў.

А потым песня паняслася,
Над хатай Коласа ўзвілася,
Нібы крынічная вадзіца,
Лілася песня маладзіцы.

Далей танцы загучалі,
Мае ножкі не ўтрывалі,
Пайшлі полечку-трасуху
З незнаёмым дзядзькам-зухам.

Гучаў, відаць, шатландскі танец,
Мы ж надавалі яму глянец,
Наш беларускі, наш пачэсны,
Бы польку, рэзалі аркестры.

Партнёр быў спрытны, малайчына,
Круціў мяне, нібы дзяўчыну,
Я таксама не драмала,
У такт танцору патрапляла.

Нават рабілі выкрунтасы,
Браліся ўбокі, пад паясы,
У канцы танца развіталіся
І смачна ўслых пацалаваліся.

А што потым, мілы Божа!..
Не кожны перадаць вам зможа,
Гучалі Коласавы творы
На іншаземных нават мовах.

Артысты ўсе як на падбор
Напаўнялі цудам двор,
Сцэнкі ставілі, імпрэзы
На розны густ і інтарэсы.

Ансамбляў шмат было на святе,
Не памясціліся б у хаце,
Народныя звінелі песні,
Дзівосны гукі ветры неслі.

Дыяспара армян, карэйцаў
Станцавала многа танцаў
Свайго карэннага народа,
О, як цудоўна, даспадобы!

Шчыра татарачка спявала,
Славян са святам віншавала,
Прыемна слухаць на ўлонні
Сяброў прыветлівыя словы.

Чатыры зграбныя пявунні
Паклон прывезлі з Наднямоння,
Спявалі песні аб Радзіме
На дзядзькі Коласа сядзібе.

У поўнач свята завяршылі,
Музей наведаць запрасілі,
Якраз экскурсія дарэчы,
Каб паглядзець паэта рэчы.

Дамоў вярталася шчаслівая,
У душы цвіла вясна гуллівая,
Ларыса Іванаўна, дружочак,
Удзячна Вам за вечарочак!

Дзеці Беслана

Чорныя змеі ў Беслане
Джалы свае распусцілі,
Праніклі, бы ў ціхую гавань,
Нявінных дзяцей акружылі.

Плакалі дзеці ў няволі,
Прасілі жыццё дараваць.
Колькі там гора і болю
Прыйшлося ім зведаць, трываць...

Як здані, стаялі шахідкі,
Іх голас дзяцей не кранаў,
Дык будзьце ж праклятыя, фашысткі,
Каб род ваш навекі прапаў!

Святы абавязак

Дзеці — наш скарб і багацце,
Павінна знаць кожная маці,
Толькі часта цяпер бывае
Карціна зусім другая.

Унукаў гадуюць бабулі,
А маці дзетак — у гулях,
На прыпынках топчуцца зранку,
Шукаюць акуркі, цыгаркі.

Шныруюць, снуюць ля крамы.
Навошта ім дзеці і мамы?
Ім бы бутэльку віна,
Такі ў іх занятак штодня.

А старэнькія, слабыя маці
Мусяць дзяцей гадаваці,
Шкада ім маленькіх птушак,
Каштоўны дарунак дачушак.

Прашу грамадскасць, дзяржаву,
Знайсці хоць якую ўправу,
Падняць, хто так апусціўся,
На святы абавязак забыўся.

Брыдкая спакуса

Падлеткі, дзеўчыны,кабеты
Цягнуць, смокчуць цыгарэты,
Трацяць грошы без прымусу
На гэту брыдкую спакусу.

Каб толькі грошы — не бяды,
Але ж здароўе нікуды,
Ужо з самага маленства
Шыбуюць людзі да калецтва.

Такую звычку не ўхваляю,
Пра нашчадкаў шчыра дбаю,
Няма найлепшага багацця,
Калі ўсе здаровы ў хаце.

На жаль, мы гэта ўспрымаем
І цану здароўю знаем,
Калі яго ўжо няма,
А самі — сенная труха.

Сніўся мацеры сон верагодны

Рабіла матуля падушкі,
Пасаг для роднай дачушкі,
Шчыравала над кожнай пярынкай,
Толькі б шчасце было ў дзяўчынкі!

Выяўлялася ўжо і прычына:
Прыглянуўся Алесі хлапчына,
Высокі, прыгожы, рахманы,
У дзеўчыну быў закаханы.

Таму, мусіць, з гэтай нагоды
Сніўся мацеры сон верагодны.
Прысніла пакойнага мужа,
Які мілаваў дачку дужа.

Гушкаў, падкідаў дзяўчынку
Вышэй кучаравай рабінкі,
Тая лятала пушынкай,
Каханага звала хлапчынку.

І раптам Алеся з Ігнатам
Увысь узняліся, над хатай,
Бацька іхні палёт бласлаўляў:
— Будзьце шчаслівы! — гучна сказаў.

Прачнулася — побач нікога,
На вуснах ад сну асалода,
Хай спраўдзяцца бацькавы словы,
Здароўя, дабра ім і згоды.

Гадавала матуля сыночка

Гадавала матуля сыночка,
Недаспала не адну, пэўна, ночку,
Грудным малачком наталяла малога,
Здароўя і долі прасіла ў Бога.

Вадзіла ў яслі і сад,
Бараніла, хоць быў вінават,
На санках катала з высокае горкі,
У школу хадзіў, з ім вучыла ўрокі.

Уладкоўвала сына на працу,
Душу аддавала дзіцяці,
З-за мяжы даставала ўборы,
Лячыла, каб быў хоць здаровы.

Пастарэла матуля, нядужа, убога,
Ад роднай крывінкі чакала падмогі,
Сын жа аднёсся іначай да маці,
Стварыў невыносныя ўмовы ў хаце.

На плечы матулі ўсеўся вярзіла,
Кармі, апранай, нясі піва, «чарніла»,
Зранку шыбуй па цыгары ў краму,
Не пойдзеш — адкруціць галоўку ў мамы.

Крычыць, лямантуе нягоднік-сынуля,
Матуля ўсё зносіць, церпіць, шчыруе.
Як жа жыць далей, дзе ёй падзецца,
Каб не сарвалася хворае сэрца?

Эх, восень, восень! Чараўніца!

Эх, восень, восень! Чараўніца!
Колькі цуду ў цябе!
Ты прыгожа, як царыца,
Скажы сакрэт свой ціха мне!

Зусім нядаўна ліст зялёны
Аздабляў у двары клён,
А сёння ў залатым уборы
Нагам маім аддаў паклон.

Сукенкі жоўтыя адзелі
Асіны, ліпы і бярозы,
Вольхі, вербы парыжэлі,
Лісты раняюць, нібы слёзы.

Побач чырванню заліўся
Зграбны малады дубок,
Яго ліст моцна ўхапіўся
За разгалісты сучок.

Цвітуць пухнатыя вяргіні,
Хрызантэмы, ачыток,
Дразды павіслі на рабіне,
Наталяюць свой раток.

Развітальны звон лістоты
І непаўторная краса
Пазбаўляюць ад самоты,
Як гітарная струна.

Дзве адзіноты

Неяк сышліся дзве адзіноты
Пазбавіць сэрцы ад самоты,
Шчабяталі, бы салоўкі,
Схіліўшы блізенька галоўкі.

Шчыра, ласкава і звонка
Лілася ў хаце іх гамонка
Аб працы ў школе, аб сям'і,
Пра тых любых, з кім жылі.

Фотаздымкі разглядалі,
Ганарыліся сынамі.
А дзень ішоў, а час круціў
І абед ім абвясціў.

Абедалі і размаўлялі,
З віном кілішкі ўздымалі
За сустрэчу, за здароўе,
Тосты былі ўсе прыстойны.

Быў і лепшы сярод іх:
За любоў, за іх дваіх,
А каб яго запамяталі,
На брудэршафт — і змацавалі...

Пакінула мажор для новай песні

Знаёмаю сцяжынкаю іду,
Цікавы субяседнік крочыць побач,
Як корчык дзе, то падае руку,
Лагодна заглядае мне ў вочы.

Шчабеча, бы шпачок ранняй вясной,
Узрушаны цяплом дзівак, няйначай,
І толькі чую сэрцам і душой:
Цешыцца ён нашаю сустрэчай.

Шчаслівым лічыць гэты дзень і час,
Мяне Венерай ледзь не называе,
На развітанне: «Як цудоўна ў нас!
Праз тыдзень я Вас зноў чакаю...»

Замест адказу падала руку,
Пакінула мажор для новай песні,
Удзячна падміргнула жаўруку,
Што звінеў над намі ў паднябессі.

Будзем жывы – сустрэнемся зноў

Гарачае лета адцвіло, адгуло,
Толькі грэюць душу ўспаміны,
Я імі жыву, адчуваю цяпло,
Якое пакінуў ты, мілы.

А за вокнамі позняя восень,
Смуткуе і журыцца ціш і спакой,
Углядаюся ў сінюю просінь,
Узнаўляю спатканні з табой.

Будзем жывы — сустрэнемся зноў,
Я веру, мой любы, у гэта,
Захмялеем ад паху сунічных бароў,
Уславім дзівоснае, цёплае лета.

Я толькі Вас бы пакахаў...

Я Вас люблю, а не кахаю,
Кахаць не суджана, на жаль,
Падзяку лёсу выражаю
За ўрачысты, светлы май.

Вы падышлі тады ў зале,
Сказалі сціпла: «Добры дзень!»
Імя сваё шчыра назвалі,
А я стаяў нібыта пень.

Чаму ж, чаму не прынёс кветкі?
Думка імгненна апякла,
Для гэтай мілае паэткі
Мне іх ніколькі не шкада.

Я абарваў бы ўвесь кветнік,
Каб знаў раней, каму нясу,
Як маху даў ты, летуценнік,
Сам гэта бачыш наяву...

Толькі праз дзень, але дабіўся
Я нумар тэлефона Ваш,
З ахапкам белых руж з'явіўся,
Памылку выправіў ураз.

Цяпер лічу сябе шчаслівым,
Што Вас сустрэў, бліжэй пазнаў,
Каб Божа хоць з дзесятак скінуў,
Я толькі Вас бы пакахаў...

Прыпомню той шчаслівы час

Ты з'явіўся нечакана,
Як месяц, выплыў з-за нябёс,
Таму не спала, а гадала:
Дарунак Бога? Ці то лёс?

Можа,не тое і не гэта,
А зман жаночае душы,
Хай будзе вінавата лета
І яго струны-міражы!..

Калі і зман, я не журуся,
Прыпомню той шчаслівы час,
Рамансы, песні, што ліліся
У выкананні толькі нас.

Як вальсы, танга танцавалі,
У пары лебедзем плылі,
Свой узрост не адчувалі,
Бо душы блізенька былі.

Тыя пачуцці захаваю
У сваім сэрцы назаўжды,
І твае словы нагадаю:
— Дзе ж мы раней з табой былі?!

Але знайду сілы прайсці...

Ва ўсе вякі, ва ўсе гады
Не дай Бог долі ўдавы...

Як бы не кляўся ў каханні,
Не мой, усё роўна не мой,
Прыемны твае мне прызнанні,
Толькі з другім я душой.

Гляджу на цябе і шукаю
Хоць кропельку, рыску яго,
А сэрца баліць, замірае:
Няма і не будзе майго.

З ім пражыла больш за трыццаць,
І адна ўжо дзевяты гадок,
Не магу на яго я забыцца,
Тым больш што падобен сынок.

Не магу пакахаць я другога,
Ён адзін у душы і жыцці,
Хай і цяжкая будзе дарога,
Але знайду сілы прайсці...

Я праменьчык табе пасылаю

Я праменьчык табе пасылаю,
Лаві яго,мой дарагі!
Калі хмарка праменьчык схавае,
Махні — і яе разгані.

Хай яркі, пяшчотны праменьчык
Сагрэе цябе, як агеньчык,
Цяплом ты яго наталяйся
І мне з-за нябёс усміхайся.

А я ўяўлю тваю ўсмешку
І буду шукаць тую сцежку,
Дзе ў маладосці блукалі,
Жыццёвыя планы складалі.

Тым планам ніколі не збыцца,
Між намі пралегла граніца,
Адолець яе — няма сілы.
Чаму ж адышоў ты, мой мілы?

Пакінуў у сэрцы пякучую рану,
Якая баліць і шчыміць несціхана.
Змагаюся з болем штодзённа, бясконца,
Табе ж пасылаю праменьчыкі сонца.

Верабей дарма стараўся

Бывалы, горды Верабей
Апошнім часам паслабеў,
Рашыў вясну правесці ў шпіталі,
Ад гарадскога шуму з'ехаць далей.

Меў асобную палату,
Па заслугах, не па блату,
Колькі хацеў, столькі і спаў,
Ніхто яго не турбаваў.

Песняй вітаў узыход сонца,
Па двары гуляў бясконца,
Слухаць жаўранка любіў,
Смачна еў і смачна піў.

Прымаў лекі па раскладу,
Не шукаў сабе прынаду,
Адпачынак на ўсе сто!..
Але нядоўга так было.

Калі акрэплі ногі, крылы,
Музыцы паддаўся мілы,
А там пярнатых — проста цьма,
Сярод іх Ластаўка была.

На яе ўскінуў вока,
Падштурхнуў сябе пад бокі,
Запрасіў на плаўны вальс,
Найлепшы для знаёмства шанс.

Ластаўка — даўно ўдава,
Цяпло адчула Вераб'я,
Той сыпаў ветлівыя словы,
Жыць хацеў пачаць нанова.

Каля хвоечак гулялі,
Амаль адно гняздо звівалі,
Вясну віталі песняй звонкай,
Душы цешылі гамонкай.

А калі танчылі яны,
Разяўлялі ўсе раты,
Каленца ўлева, два ўправа,
Верабей — танцор удалы.

Абаім было прыемна
Сябраваць у час лячэння,
А потым іх саюз распаўся,
Верабей дарма стараўся.

Узвілася Ластаўка ўвысь,
Прашчабятала:«Не ганіся!
Прабач! Не вінавата я,
Свайго кахаю Салаўя.»

Магчыма, ім стану і я

Я марыў: мяне ты ашчаслівіш
На схіле пражытых гадоў,
Настрой мне пяшчотай уздымеш,
Жыццю надасі плён ізноў.

Я верыў табе, мой агеньчык,
Паддаўся, наіўны, цяплу,
Наталяў мяне свежы струменьчык,
А сэрца шаптала: кахаю, люблю...

Мне здалося: і ты закахана ,
Радасць, душэўнасць мая,
Чаму ж абарвала так рана
Палёт у свайго вераб'я?

Як нікому, табе давяраў,
Меў надзею і верыў душы,
Званіў і лісты пасылаў,
Ты ж думала: тчэ міражы.

Дарэмна сябе адзінотай марнуеш,
Не вернеш свайго салаўя,
Спадзяюся: мяне ты пачуеш,
Магчыма, ім стану і я.

Дзелавая

Цётка Манька — дзелавая,
Лапатай грошы заграбала,
Без ліцэнзіі, дазволу
Адкрыла продаж самагону.

Ад світання да змяркання
Гандлявала, нібы ў краме,
Ні полудня, ні выхаднога
Не мела цётчына бярлога.

Хто толькі там не банкаваў,
Рублі апошнія страсаў,
Праўда, нядоўга існавала
Увішнай цёткі Манькі справа.

Прыбыў на месца ўчастковы —
І закрыўся цэнтр гандлёвы.
Два гады сядзела Манька
За прапаганду ў вёсцы п'янкі.

Без Марусі — я ніхто

Без Марусі — я ніхто,
Аб гэтым ведаю даўно,
Толькі Марусі не хвалюся,
Страціць яе вельмі баюся.

Мая Маруся не благая,
Варыць, парыць, абмывае,
Прабачае звычкі, жарты,
Пахвалы найлепшай варта.

Толькі б не задзерла нос,
Тады прапаў я, як Барбос,
Не дай Бог прагоніць з хаты,
Дзе ж падзецца небараку?

Жанчын хапае, гэта так,
Але я ўжо не «рыбак»,
Не маёр і не палкоўнік,
А звычайны ў ЖЭКу дворнік.

Пенсія — як кот наплакаў,
І не радуе зарплата,
Трымацца буду я Марусі,
А то ў бамжа ператвараюся.

І наб'ю суседу рогі

Гучна, весела і бойка
Трызвоніла суседцы Зойка:
— Сёння пайду на імяніны
Да сваёй сяброўкі Зіны.

Каб толькі мой дзе не набраўся,
Прыйсці дамоў раней стараўся.
А цяпер бягу ў краму,
Куплю ёй хустачку да твару.

Тым часам яе любы Мішка
Набіў ужо на ілбе шышку,
Звaліўся бедны за парогам,
Падпёр дзверы, нібы рогам.

Зойка думала, што дзверы
Набраклі крыху і аселі,
Ломам стукнула, піхнула,
Ды так мужу лупянула!

Зароў Мішка, як мядзведзь:
— Ледзь не забіла мяне, ледзь!
Спрабаваў устаць з падлогі,
Але не слухаліся ногі.

Усё гэта Зойку ўгнявіла,
У злосці мужу заявіла:
— Зайду да Фёдара — суседа,
Вазьму з сабою на бяседу.

— Кінь жарты, жонка, адасплюся,
К канцу бяседы заяўлюся,
І наб'ю суседу рогі,
Калі пяройдзе мне дарогу.

Вэрхал

Дзед Пятрусь і баба Каця
Вэрхал справілі ў хаце:
—-Кацярына! Дзе бутэлька,
Што дала суседка Гэлька?
Я дзянёк вазіў ёй гной
За бутэльку той хмяльной!
—-Не брала я, мой галубок,
Можа, паставіў дзе ў куток.
— Усё абшукаў: куткі, запечкі,
Рассыпаў поўну торбу грэчкі,
Нават глянуў у кармушкі
Нашай карміцелькі-цялушкі.
Здаецца б, свет перакуліў,
Толькі бутэлькі след прастыў!..
Суровеў, сердаваў дзядуля,
Асінай трэслася бабуля,
Але якраз прачнуўся ўнук
І ўляпіў, нібы ў сук:
— Дарма шукалі барматуху,
Яна ўжо скісла ў маім бруху.
А ты, дзеду, схадзі да Гэлькі,
Скажы: адробіш за бутэльку.
Каля цябе й я пахмялюся,
А не — дык зверам я зраблюся...

Рыжая красуня

Жыла пад Лысаю гарой
У норцы цеснай і старой
Красуня рыжая — Лісіца,
Даўно была ўжо ўдавіца.

А побач стары Заяц збудаваўся,
У суседку вельмі закахаўся,
Прывёў Ліску ў хаціну,
Зрабіў сапраўднай гаспадыняй.

Рыжуха Зайца не кахала,
Хаціну ж яго ўпадабала,
Навяла ў ёй марафет,
Гатавала смачна абед.

Касы быў у захапленні,
У шчасці, радасці, здзіўленні,
Выхваляўся перад Воўкам:
— Залатая ў мяне жонка!...

Хітруха Зайца мілавала,
На вушка ветліва шаптала:
— Мала што здарыцца з табой,
Зноў застануся ўдавой.

Выганяць пасынкі з хаты,
Дзе ж тады пагрэць мне пяты?
Падары мне сваю хатку,
Дагледжу цябе, як дзіцятка.

Бачыш, накормлены, прыбраны,
Не будзеш каяцца, каханы,
Дзве палавінкі мы з табой,
Не прападзеш, мілы, са мной.

Заяц вушы навастрыў,
Але хаціну падарыў,
І ўраз Ліса стала ваўчыцай,
Як бы яе хто калоў спіцай.

Усё не гэтак і не так:
— Ты палахлівец і лайдак,
Гулёна, шэры абібок,
Задраў бы цябе лепей воўк.

Я б шчаслівейшаю была,
Жаніха лепшага знайшла,
Бо і цяпер яшчэ царыца,
Не горшая за маладзіцу.

У маю хату ні нагой,
Бо надаела мне з табой,
Цяпер цёпла пад ялінай,
Выбірайся хутчэй, мілы.

А замарозіць — не загінеш,
За плату маю норку здымеш,
Падладзіш трохі, галля многа,
Толькі туды табе дарога.

Апусціў Заенька вушы:
— Што ты зробіш? Цярпець мушу.
Хіба Воўк мне дапаможа?
Здзекавацца так не гожа.

Прысеў Шэры на пянёк,
А тут як тут жаданы Воўк.
— Будзь сябрам, Воўча, падсабі,
Пышны хвост Лісе парві.

Без хваста што яна значыць?!
Вось тады хай і пабачыць,
Як крыўдзіць Русака старога,
Пра жаніха марыць другога.

Падобнае бывае і ў нас,
Усяго чакаць можна падчас.
Такія Ліскі не міргаюць,
А справу сваю добра знаюць.

Таму параіць шчыра мушу:
Вастрэй трымайце, хлопцы, вушы!
Лепш разбірайцеся ў жанчынах,
Салодкіх сваіх палавінах!

Не заўсёды іхняй ласцы верце,
Каб заўчасна не паддацца смерці,
Менш на хцівых Лісак пазірайце,
З чулым сэрцам жонку выбірайце!..

Гэта вам, Бабры, навука

Жыў на возеры Бабёр,
Нямала год меў ужо ён,
Але пры сіле йшчэ, пры моцы,
Як глісер, плаваў у затоцы.

Пілаваў лазняк, асінкі,
Корм рыхтаваў на ўсю зімку,
Будаваў плаціну, хатку,
Усё даводзіў да парадку.

Цёмна-буры халасцяк
Быў пакуль што не жанат,
Усе ночы напралёт
Працаваў на свой жывот.

Праўда, раз сустрэў каханне...
Неяк прыбілася ўранні
Выдра з суседняе ракі,
Яе тут вабілі лінькі.

Рыба, жабы і малюскі
Для Выдры — лепшыя закускі,
Ракаў таксама паважала,
У вадаёме іх хапала.

Яшчэ драпежніца ўночы
Пагуляць была ахвоча,
Калі Бабёр дрэвы валіў,
У выдры госць жаданы быў.

Прысеў Шэры на пянёк,
А тут як тут жаданы Воўк.
— Будзь сябрам, Воўча, падсабі,
Пышны хвост Лісе парві.

Без хваста што яна значыць?!
Вось тады хай і пабачыць,
Як крыўдзіць Русака старога,
Пра жаніха марыць другога.

Падобнае бывае і ў нас,
Усяго чакаць можна падчас.
Такія Ліскі не міргаюць,
А справу сваю добра знаюць.

Таму параіць шчыра мушу:
Вастрэй трымайце, хлопцы, вушы!
Лепш разбірайцеся ў жанчынах,
Салодкіх сваіх палавінах!

Не заўсёды іхняй ласцы верце,
Каб заўчасна не паддацца смерці,
Менш на хцівых Лісак пазірайце,
З чулым сэрцам жонку выбірайце!..

Гэта вам, Бабры, навука

Жыў на возеры Бабёр,
Нямала год меў ужо ён,
Але пры сіле йшчэ, пры моцы,
Як глісер, плаваў у затоцы.

Пілаваў лазняк, асінкі,
Корм рыхтаваў на ўсю зімку,
Будаваў плаціну, хатку,
Усё даводзіў да парадку.

Цёмна-буры халасцяк
Быў пакуль што не жанат,
Усе ночы напралёт
Працаваў на свой жывот.

Праўда, раз сустрэў каханне...
Неяк прыбілася ўранні
Выдра з суседняе ракі,
Яе тут вабілі лінькі.

Рыба, жабы і малюскі
Для Выдры — лепшыя закускі,
Ракаў таксама паважала,
У вадаёме іх хапала.

Яшчэ драпежніца ўночы
Пагуляць была ахвоча,
Калі Бабёр дрэвы валіў,
У выдры госць жаданы быў.

Але аднойчы нечакана
Бабёр з'явіўся дамоў рана,
Застаў каханку з сябруком,
Абаім паддаў хвастом.

Віны Выдра не прызнала,
Перад Бабром у позу стала:
— Начамі ў цябе грызня,
А да мяне справы няма.

Я — не твайго ягада поля,
Павучаць мяне даволі,
Агідны ты, абрыдла хатка,
Не па Ягору твая шапка.

Не прыносіш мне прысмакі,
Кавалер з цябе ніякі,
Ноч грызеш, а ўдзень дрэмлеш,
Кахаць мяне зусім не ўмееш.

Ты ненавісны мне, не люб,
Дарма прыгрэлася я тут,
Не будзе больш маёй нагі,
Пайду ў свае я берагі.

З тых пор Бабёр на вус матае,
Жонку-грызунню падбірае,
Каб з ёю плаваць уначы
І здабываць разам харчы.

Вось такая выйшла штука,
Гэта вам, Бабры, навука,
Падумайце, пакуль жаніцца
І ў выбары не памыліцца.

Раўнівіца

Пэўна, ужо год таму назад,
Як падсабляў Алёне сват,
Агледзеў хату, двор і плот,
Работы шмат, неўправорот.

Муж сабакам касіў сена,
Душа па дзецях не балела,
Сын — падлетак, яшчэ слабы
Важныя выконваць справы.

Алёна й сёлета рашыла,
Вячаславу пазваніла:
— Не за гарой, сваток, зіма,
Ратунку ад яе няма.

Не магу пратапіць грубку,
Дыміць халера, нібы трубка,
Прыйдзі, сваточак, паглядзі,
Знайдзі ты лекі ёй, знайдзі.

Ваця паслухаў, малайчына!
У грубцы выявіў прычыну,
Усе пазы замазаў глінай,
Затапілі — не дыміла.

Пакуль сват поркаўся ля грубкі,
Заняты былі свацці рукі:
Дастала даўнія запасы,
Вяндліну рэзала, каўбасы.

Нават купіла каньяку,
Каб дагадзіць свайму сватку.
На стол паставіла ўсё чыста,
Нібы на свята ўрачыста.

Не знала бедная Алёна,
Што Маня шнырыць каля дома,
Моцна раўнуе свайго Вацю
Да адзінокай пекнай свацці.

Цішком падлезла пад акно,
У хаце ўсё чутно й відно,
Як налівалі, смакавалі,
Тосты прыемныя казалі.

Калі тост трэці ўздымалі,
Нервы здалі ў свацці Мані,
Аддзерла камень ад падмурка
І запусціла мужу ў вуха.

Ваця за вуха ўхапіўся,
Карчаком пад стол зваліўся,
Крывёй заліўся, як кабан,
Моцна крычаў: «Ну! Хтось і даў!»...

Свацця спужалася, завыла,
Лямантавала:«Божа мілы!
Які ж дурань так зрабіў?
Чуць майго свата не забіў!...»

Ды бразнула ў сенцах клямка,
Верашчала свацця Манька:
— Гэта табе за заляцанне
Выдала маё каханне!...

Сват ачухаўся, абмыўся,
Перад жонкай расхрабрыўся:
— Прэч з хаты са сваім каханнем!
Я застануся тут да рання.

А калі згодна будзе свацця,
Жыццё прадоўжу ў гэтай хаце,
Ты кожны дзень ясі, грызеш,
Жыць мне спакойна не даеш.

Сядзем, Алёнушка, за стол,
Трэці тост з табой дап'ём,
Не прападзеш са мной, галубка,
Бач, як грэе наша грубка.

Алёна — мудрая жанчына,
Сватоў ледзь-ледзь угаманіла,
Сама ж ні ў чым не вінавата,
Але з тых пор не просіць свата.

ЗМЕСТ

Паэмы

Радаслоўная 6
Гэта вашых продкаў лёс 29
Усё, бадай, як у людзей 38
Парою толькі б і глядзела 49
Васільком дык Васільком 57
Схіліце галаву над імі!. 64
Ізноў я ў дарозе-пуціне 76
Прыйшоў наш час... 85

Вершы

Дару сябе паэзіі 102
Пішу сабе строгія ўказы... 104
Як мне цябе не хапае!.. 105
Слядочкі 106
Было б толькі ўсё там да толку 107
І мроіцца зноў успаміны... 108
І толькі з вамі боль перанясе 109
Каб доўга нашчадкаў чакалі 110
Я помню вас жывой 111
Быль Лагойшчыны. 112
Неслі святую Перамогу 114
Мы рады адкрыцца душой 116
А сэрцам адчуваю, нібы дома 117
Мілая Белая Русь! 118
Елачкі-паненкі 119
У гонар ночанькі музейнай 120
Дзеці Беслана 123
Святы абавязак 124
Брыдкая спакуса 125

Сніўся мацеры сон верагодны 126
Гадавала матуля сыночка 127
Эх, восень, восень! Чараўніца! 128
Дзве адзіноты 129
Пакінула мажор для новай песні 130
Будзем жывы – сустрэнемся зноў 131
Я толькі Вас бы пакахаў... 132
Прыпомню той шчаслівы час 133
Але знайду сілы прайсці... 134
Я праменьчык табе пасылаю 135
Верабей дарма стараўся 136
Магчыма, ім стану і я 138
Дзелавая 139
Без Марусі — я ніхто 140
І наб'ю суседу рогі 141
Вэрхал 142
Рыжая красуня 143
Гэта вам, Бабры, навука 146
Раўнівіца 148



Я не пісаць, не думаць не магу.
Мінае час. За вокнамі світае.
Магчыма, нехта і маю тугу,
І радасць выпадкова прачытае.

Сяргей Грахоўскі

ISBN 985-6772-26-5